Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№ 66 (28682)
6 КРАСАВІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА
Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА



Вёска: як затрымаць кадры?
СТАР. 4



Кіно будзе. Калі... высахне
СТАР. 5



Фермерства ў Беларусі. Праблемы росту
МС

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ДВОРНІК, старшыня Гомельскага аблвыканкама:**

*«У рабоце са зваротамі грамадзян аптымальныя шляхі вырашэння пытанняў дапамогуць вызначыць комплексны падыход і аналіз. І вельмі важна кіравацца законам і логікай. Калі, скажам, сёння чалавек прыйшоў у сяло з жаданнем працаваць, дайце яму зямлі столькі, колькі ён хоча і, галоўнае, можа апрацаваць. Зразумела, у рамках заканадаўства і не на шкоду суседзям».*

ISSN 1990 - 763X

# КАЦЯРЫНІНЫ КУЛІЧЫ



Жыхарка вёскі Луткі Столінскага раёна Кацярына ЛЯСЬКО рыхтуецца да Вялікадня. Як і многія яе аднавяскоўкі, Кацярына Пятроўна карыстаецца старадаўнімі народнымі рэцэптамі — загадзя замешвае цеста, паліць у печы і выпякае духмяныя велікодныя булкі.
**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Рынак вакансій

## Мінчане хочуць працаваць дырэктарамі,

### а жыхары Брэстчыны — жывёлаводамі

**Колькі часу ідзе ў беларусаў на пошук работы? Які рэгіён лідзіруе ў зарплатным рэйтынгу? Ці супадаюць папулярныя прафесіі ў наймальнікаў і саіскальнікаў? Якім спецыялістам абяцаюць толькі «мінімалку», а каму гатовы плаціць 20 тысяч рублёў? Пра гэта і іншае — у аглядзе рынку працы.**

### У поўным росквіце сіл, але без работы

Зарэгістраванае беспрацоўе некалькі месяцаў трымаецца на ўзроўні 0,5 працэнта. Традыцыйна большасць тых, хто сядзіць без работы, — мужчыны. На іх долю прыпадае 64 % ад агульнай колькасці незанятых грамадзян. Шмат беспрацоўных ва ўзроставых катэгорыях 40—49 і 55—57 гадоў. Амаль пятая частка з ліку незанятых — моладзь ад 16 да 30 гадоў.

Хто аказваецца ў шэрагах беспрацоўных? Тэндэнцыі тыя ж, што і год, і два таму. Чвэрць тых, хто стаіць на ўліку ў органах занятасці, — беларусы, якія доўга не працуюць. 22 % — звольненыя па пагадненні бакоў. Яшчэ 8,7 % былі звольнены з уважлівай прычыны, 4,2 % — па ўласным жаданні, 3,9 % — за парушэнне працоўнай дысцыпліны. Кожны трынаццаты беспрацоўны выйшаў з месца пазбаўлення волі ці лячэбна-працоўнага прафілакторыя. Нядаўніх выпускнікоў каледжаў, ліцэяў і універсітэтаў сярод незанятых грамадзян нямнога — 1,6 %. Мала на ўліку ў якасці беспрацоўных і былых прадпрымальнікаў — усяго 0,5 %.

У сярэднім, каб знайсці работу, беларусу патрабуецца два месяцы. Мужчыны спраўляюцца з гэтай задачай на тры дні хутчэй за жанчын. А моладзь паспявае працаўладкавацца за 1,6 месяца. СТАР. 4

■ Блакітныя «палеткі»

## ЧАКАЕМ НАДВОР'Я ДЛЯ... КАРПА

### Сёлета вырошчваць яго не так затратна

**Карп, шчупак, белы амур і сом. Велізарнымі сеткамі рыбу цягнуць да берага. Апускаюць у машыны. І перавозяць у спецыяльныя басейны. А адтуль і да нашага стала...**



### Рэнтабельны 7 з 20

Па словах экспертаў, беларусы з'ядаюць да 175 тысяч тон рыбы ў год. «Спажыванне такое — закупляецца ад 120 да 165 тысяч тон у год, плюс каля 10 тысяч тон мы вырошчваем зараз самі. Дзесьці 80 % таго, што вырабляем, — карп. Зараз даводзіцца, каб яго было менш, з'явілася разнастайнасць за кошт будаўніцтва новых індустрыяльных комплексаў, дзе разводзіцца фарэль, асетр. Рух ідзе наперад», — паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі Мінсельгасхарча Наталля СОНІЧ.**

Спецыяліст адзначае, што да 2020 года рыбнаму комплексу неабходна выйсці на вытворчасць 18,2 тысячы тон таварнай рыбы. Гэта павінна быць 15,8 тысячы тон сажалкавай рыбы, 1187 тон азёрнай і каля 1,2 тоны каштоўных парод рыб. СТАР. 3

# НА ШЛЯХУ ДА АДНАЎЛЕННЯ

**З першых вуснаў даведацца пра сітуацыю ў Сірыі меў магчымасць Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам па справах палаца Прэзідэнта Сірыі Мансурам Азамам. На гэтым тыдні ён прыехаў у Беларусь з пяцідзённым візітам.**

Мансур Азам перадаў кіраўніку беларускай дзяржавы асабісты ліст ад Прэзідэнта Сірыі Башара Асада. У ім, як растлумачыў міністр журналістам, сірыйскі лідар падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за пазіцыю нашай краіны і адносіны да Сірыі і яе народа. Прэзідэнт Беларусі пацвердзіў, што наша дзяржава падтрымлівае сірыйскі народ у барацьбе з тэрарызмам.

Акрамя таго, размова ішла пра аднаўленне эканомікі і інфраструктуры Сірыі (каля 70 % інфраструктурных аб'ектаў у краіне разбурана). Вялікая ўвага была ўдзелена перспектывам мірнага развіцця Сірыі. Беларускі вопыт у будаўніцтве сацыяльна значных аб'ектаў, як бальніцы і школы, можа спатрэбіцца гэтай дзяржаве.

Сірыйскі міністр адзначыў, што такая сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі з'яўляецца «зялёным сігналам» для супрацоўніцтва, які неабходны для канкрэтных крокаў на ўзроўні ўрадаў. Мансур Азам расказаў, што беларускі і сірыйскі ўрады цесна супрацоўнічаюць, рыхтуецца сумеснае пасяджэнне, у якім прымуць удзел міністэрствы прамысловасці, сельскай гаспадаркі і харчавання і іншыя дзяржаўныя структуры. Плануюць, што яно адбудзецца ў найбліжэйшыя месяцы ў Дамаску. Мансур Азам заўважыў, што ў аднаўленні краіны Сірыя разлічвае на ўдзел Беларусі і тых краін, якія выступалі ў падтрымку сірыйскага народа.

Падчас свайго візіту ў Беларусь міністр па справах палаца Прэзідэнта Сірыі наведаў у тым ліку МАЗ. Прадпрыемства прапрацоўвае магчымасць рэалізацыі кантрактаў на пастаўку ў Сірыю 157 самазвалаў і 200 аўтобусаў, а таксама арганізацыю зборачнай вытворчасці.

У 2015—2017 гадах сірыйскаму боку ад Беларусі перададзены тры партыі гуманітарнай дапамогі: прадукты харчавання, лекі, адзінчае адзенне і абутак, тры аўтамабілі МАЗ. Летась у жніўні 80 сірыйскіх сірот і дзяцей баявых афіцэраў, якія загінулі ў контртэрарыстычных аперацыях, адпачывалі і аздараўляліся ў Беларусі. Сёлета плануецца арганізаваць аздараўленне да 500 сірыйскіх дзяцей. Першыя з іх — 144 чалавекі — прыязджалі ў студзені ў «Зубраня». Яшчэ дзве групы плануецца прыняць у маі — чэрвені.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## Парламенцкі дзённік

# У ПЕРСПЕКТЫВЕ — ЧАРТАРЫ НА КУБУ

**Новы кубінскі пасол прапануоўвае арганізаваць прамы чартарны рэйс у яго краіну з вылетам з Беларусі. Пра гэта Хуан Вальдэс Фігероа заявіў падчас сустрэч з кіраўнікамі палат беларускага парламента. Яны былі арганізаваны з нагоды пачатку яго дыпламатычнай місіі ў нашай краіне.**

Па словах пасла, тры тысячы беларусаў летась наведалі Кубу ў якасці турыстаў, а ўсяго ў краіну ўехала каля пяці мільёнаў тых, хто жадаў адпачыць. Дыпламатычны прадстаўнік мяркуе, што можна павялічыць колькасць гасцей з Беларусі, выбудоўваючы адпаведныя ўмовы. Напрыклад, увесці чартарныя рэйсы з Беларусі на Кубу.

Такая прапанова зацікавіць не толькі беларусаў, але і жыхароў суседніх краін, перакананы ён. «Калі мы створым з «Белавія» чартарныя рэйсы на Кубу, магчыма, паменшым кошт білетаў на пералёт, час, які на гэта затрачваецца», — адзначыў пасол на сустрэчы з Уладзімірам Андрэйчанкам, старшынёй Палаты прадстаўнікоў. Такімі краінамі могуць стаць Літва, Латвія, а таксама Польшча і Украіна. Думку пра арганізацыю рэйсаў дыпламат агучыў і старшыні Савета Рэспублікі Міхаілу Мясніковічу, які сказаў, што гэта прапанова будзе вывучана.

На думку Міхаіла Мясніковіча, варта больш актыўна працаваць у сферы фармацэўтыкі, стварыць сумесныя вытворчасці лекавых прэпаратаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

# ДА НЯДБАЙНЫХ ПРЫМУЦЬ МЕРЫ

**Даручэнне Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі па праверцы арганізацый АПК і выяўленні праблемных пытанняў будзе выканана тэрмінова, запэўніў падчас наведвання Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці генеральны пракурор Беларусі Аляксандр КАНЮК, перадае БЕЛТА.**

— Кіраўнік дзяржавы загадаў нам жорстка рэагаваць на ўсе факты нядбайнасці, разбазарвання і крадзяжу маёмасці, — паведаміў ён. — Пры гэтым наша галоўная задача не проста выявіць, але і ліквідаваць парушэнні ў самыя кароткія тэрміны. Вельмі важна, і я папярэдзіў на нарадзе рабочай групы 4 красавіка пракурораў і іншыя ведамствы, каб праверкамі не перашкодзілі пасяўной, а ўсё было зроблена акуратна і ва ўзаемасувязі.

Нагадаем, што рабочыя групы па праверцы сітуацыі ў сельскагаспадарчых арганізацыях працуюць з 5 красавіка. У іх увайшлі прадстаўнікі Камітэта дзяржкантролю, Генеральнай пракуратуры, МУС і Следчага камітэта. Мерапрыемствы праводзяцца ў форме маніторынгаў. Асноўны акцэнт падчас праверак будзе зроблены на праблемных пытаннях, што прагучалі на рэспубліканскім семінары-нарадзе аб развіцці вёскі і павышэнні эфектыўнасці аграрнай галіны краіны. Разам з гатоўнасцю гаспадарак да вясенняй сяўбы ў цэнтры ўвагі будуць і пытанні эфектыўнага выкарыстання тэхнікі, сельскагаспадарчых аб'ектаў, навядзення парадку на зямлі, своечасовасці выплаты заробку работнікам, захаванасці паліва, недапушчэння фактаў прыпісак і г. д.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ГАЛОЎНАЕ — СУМЛЕННАСЦЬ І ПРЫСТОЙНАСЦЬ

**На гэта звярнуў увагу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас назначэння міністра лясной гаспадаркі, намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта і генеральнага дырэктара БелТА. Беларускі лідар адзначыў, што гэта важна «ў адносінах з працоўнымі калектывамі, з іншымі. Сумлення ўсё павінна быць. Усё ў законах не прапішаш. І, калі дзесьці не хапае заканадаўчай базы, дзейнічай па сумленнасці».**



**Віталь ДРОЖЖА** цяпер займае пасаду міністра лясной гаспадаркі. Сваю працоўную дзейнасць ён пачаў у Лагойскім лягсгасе на пасадзе рабочага. Потым служыў, быў ляснічым Чырванашабабаўскага ляснііцтва Лагойскага лягсгаса, галоўным інспектарам аддзела кантрольна-рэвізійнай работы і дзяржаўнага кантролю за лесам Міністэрства лясной гаспадаркі Беларусі. З 2008 па 2013 год кіраваў Бабруйскім лягсгасам. Пасля гэтага і да новага назначэння працаваў на пасадзе генеральнага дырэктара Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што новы чалавек на такой пасадзе — гэта поўная перавага: «Вы чалавек чысты, і рукі ў вас чыстыя, вопыт ёсць. Дзейнічайце і не глядзіце па баках». Прэзідэнт папярэдзіў, што «хацелася б, каб вы гэтую вашу добрую якасць — што вы нікому нічога не абавязаны і ні на кога не завязаны, як у нас гавораць, — увасобілі ў жыццё. Лёгка вам не будзе. Вы ведаеце маё стаўленне да прыроды і лесу».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што самае галоўнае — навесці парадак: «Каб за хабар леснікі і ляснічыя не сплаўлялі лес і каб гэты лес за дробязь, капейкі, за цэнты не трапляў на захад, а адтуль яны нам з гэтага лесу не везлі мэблю». Аляксандр Лукашэнка дадаў, што да лесу патрэбны дзяржаўны, гаспадарчы падыход. Таксама Прэзідэнт закрануў тэму высадкі новых саджанцаў. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што трэба не толькі аднаўляць лес там, дзе яго высякаюць, але і займаць вольныя плошчы. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што сам плануе сёлета заняцца пасадкай маладых дрэў.



**Уладзімір ЖАЎНЯК** быў назначаны на пасаду намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. Ён нарадзіўся ў Хойніках, скончыў спачатку Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча, потым — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. З 2002 года працаваў галоўным спецыялістам, саветнікам-кансультантам аддзялення заканадаўства па пытаннях нацыянальнай бяспекі, праваахоўных і судовых органаў Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Беларусі, а з 2006-га стаў намеснікам начальніка гэтага аддзялення. Праз два гады ўзначаліў упраўленне заканадаўства аб нацыянальнай бяспецы і праваахоўнай дзейнасці Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь. З 2014 года да новага назначэння працаваў на пасадзе намесніка дырэктара Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў сферы ідэалогіі неабходна асучасніць сістэму: «Таму што ездзіць па працоўных калектывах і з імі весці дыялог, размаўляць — гэта вельмі важна, заўсёды з людзьмі трэба размаўляць. Але гэтага ўжо мала. Ва ўсе працоўныя калектывы не паедзеш і з дзесяцю мільёнамі не пагаворыш». На гэтай пасадзе Уладзімір Жаўняк будзе курыраваць ідэалагічную работу, грамадскія арганізацыі і СМІ. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што адпаведныя кірункі некаторы час таму спрабавалі аддаць у сферу адказнасці першага намесніка. «Але ад гэтай ідэі, шчыра кажучы, сёння і я, і кіраўнік Адміністрацыі адмаўляемся. Нам патрэбны такі чалавек, які будзе ўмець і сам размаўляць з людзьмі, і займацца са сродкамі масавай інфармацыі, грамадскімі арганізацыямі, іх, і іншымі пытаннямі, якія датычацца ідэалогіі нашай дзяржавы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Тым часам першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта працягне адказваць за такія кірункі, як адукацыя, культура, спорт і міжнародная дзейнасць.



**Ірына АКУЛОВІЧ** зараз будзе працаваць на пасадзе генеральнага дырэктара БелТА. Яна была абраная членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання ад Магілёўскай вобласці, з'яўляецца членам Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве. З 2009 года працавала дырэктарам тэлерадыёкампаніі «Магілёў».

Аляксандр Лукашэнка станоўча ацаніў тое, што Ірына Акуловіч прыйшла «знізу». Свой працоўны шлях у журналістыцы яна пачала з пасады ўласнага карэспандэнта. «Хацелася б, каб вы не проста падтрымалі той трэнд, які быў зададзены Жуком (папярэднім генеральным дырэктарам БелТА. — **Аўт.**) да вас, але, каб яшчэ на прыступку падняліся вышэй», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ДОНАЛЬД ТРАМП АДПРАЎЛЯЕ НАЦГВАРДЫЮ НА МЯЖУ З МЕКСІКАЙ

**Яна будзе абараняць ЗША ад мігрантаў і «членаў бандыцкіх груповак».**

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп распарадзіўся прыцягнуць Нацыянальную гвардыю — рэзервістаў, якія прайшлі ваенную службу, — да аховы мяжы ЗША з Мексікай. Такое рашэнне амерыканскі лідар растлумачыў тым, што «сітуацыя на паўднёвай мяжы дасягнула крытычнага пункта» — з-за патокаў мігрантаў, кантрабанды і наркотыкаў. У самой Мексіцы рашэнне ўспрынялі негатыўна: кандыдаты ў прэзідэнты краіны назвалі крок Дональда Трампа абразлівым і пагрозлівым масавымі пратэстамі.

Дональд Трамп заклікаў улады Мексікі і Кангрэс ЗША прыняць тэрміновыя меры для аховы амерыкана-мексіканскай мяжы ўвесь апошні тыдзень. Так, 1 красавіка амерыканскі прэзідэнт пагразіў Мексіцы тым, што ЗША выйдуць з Паўночнаамерыканскай зоны свабоднага гандлю (НАФТА), калі суседняя краіна не «спыніць патокі наркотыкаў і людзей, якія ідуць праз паўднёвую мяжу».

## ВЯРХОЎНЫ СУД БРАЗІЛІІ ДАЗВОЛІЎ АРЫШТАВАЦЬ НА 12 ГАДОЎ ЭКС-ПРЭЗІДЭНТА, ЯКІ ГАТОВЫ ЗНОЎ ВЫЙГРАЦЬ ВЫБАРЫ

**Вярхоўны суд Бразіліі дазволіў змясціць экс-прэзідэнта рэспублікі Луіса Інасіу Лулу да Сілву ў турму для выканання абвінавáўчага прысуду па справе аб карупцыі.**

Дэбаты па справе былога нацыянальнага лідара доўжыліся больш за 10 гадзін і транслíраваліся на YouTube. У студзені сёлета суд другой інстанцыі павялічыў тэрмін турэмнага зняволення Лулы да Сілвы з дзевяці гадоў і шасці месяцаў да 12 гадоў і аднаго месяца. Ён з'яўляецца фігурантам сямі крымінальных спраў. У ліпені мінулага года суд вынес вердыкт па адной з іх, прызнаўшы экс-прэзідэнта вінаватым у карупцыі і адмыванні грошай і асудзіўшы яго да дзевяці гадоў і шасці месяцаў турэмнага зняволення. Яму таксама было забаронена займаць дзяржаўныя пасады на працягу 19 гадоў.

Такім чынам, Лула да Сілва ўжо амаль напэўна будзе пазбаўлены права зарэгістраваць сваю кандыдатуру на выбарах прэзідэнта Бразіліі, якія пройдуць у кастрычніку. Нягледзячы на шматлікія абвінавачванні ў карупцыі, былы кіраўнік дзяржавы (Лула да Сілва займаў гэты пост у 2003—2011 гадах) усё яшчэ лічыцца фаварытам прэзідэнцкай гонкі: ужо зараз за яго гатовы прагаласаваць амаль 34 працэнты выбаршчыкаў.

## СМІ: ЗША НА ДНЯХ АБВЕСЦЯЦЬ АБ НОВЫХ САНКЦЫЯХ СУПРАЦЬ РАСІЙСКІХ АЛІГАРХАЎ

**Адміністрацыя прэзідэнта ЗША Дональда Трампа ў найбліжэйшы час аб'явіць аб увядзенні санкцый супраць некалькіх расійскіх алігархаў, звязаных з Уладзімірам Пуціным, у рамках справы аб умяшанні ўладаў РФ у амерыканскія выбары 2016 года.**

Пра гэта паведамляе тэлеканал CNN са спасылкай на высокапастаўленыя крыніцы ў Белым доме. Як стала вядома журналістам, афіцыйна аб новых абмежавальных мерах будзе абвешчана ўжо на гэтым тыдні. Тым часам агенцтва Reuters удакладняе, што новыя санкцыі супраць Расіі могуць стаць «самымі агрэсіўнымі» за апошні час і накіраванымі менавіта супраць расійскай бізнес-эліты. Гэты крок, які непасрэдна закране людзей, блізкіх да Пуціна, адлюстроўвае жаданне Вашынгтона, каб Расія панесла адказнасць за ўмяшальніцтва ў выбары.

Газета The Washington Post, у сваю чаргу, тлумачыць, што новыя санкцыі будуць эканамічнымі.

■ На слыху

# БЛОГЕР = ЖУРНАЛІСТ?

## Абмяркоўваем змяненні ў Закон аб СМІ

**На інтэрнэт-старонках многіх выданняў і ў сацыяльных сетках такое абмеркаванне адбываецца ўжо некалькі дзён. Учора да яго падключыўся Беларускі саюз журналістаў.**

Пра тое, што прапанаваныя змены наведуць парадак у медыясферы, казаў **старшыня Беларускага саюза журналістаў Анатоль ЛЕМЯШОНАК**.

— У тых, хто выступае ў інтэрнэце, ёсць пэўныя перавагі: недакладнасць можна ўзяць і выправіць, — разважаў кіраўнік прафесійнага саюза. — У газеце надрукаванае слова ўжо не высечаш сякерай. З іншага боку, спроба паўплываць на судовыя рашэнні ў журналістаў СМІ заўсёды была немагчымая. Зараз жа, калі адбываецца падзея, якая хвалюе грамадства, пачынаецца яе бурнае абмеркаванне на форумах, у каментарыях да публікацый ў інтэрнэце — яшчэ да завяршэння расследавання, да вынясення прысуду і тэарэтычна можа паўплываць на рашэнне суддзі. Зараз будзе наведзены з гэтым парадак. Вы хацелі быць журналістамі — калі ласка, але ёсць Закон аб СМІ.

Спікеры ў Доме журналіста (офіс БСЖ) пагадзіліся, што неабходнасць прававога рэгулявання медыйнай сферы даўно наспела. **Намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў Сяргей СВЕРКУНОЎ** прывёў прыклад абмеркавання сучаснай сітуацыі ў СМІ, якое адбылося некалькі гадоў таму на прафесійным семінары ў Рэчыцы. «Рэдактар раённай газеты прыводзіў прыклад: блогер фейкавымі навінамі забяспечвае вялікую колькасць праглядаў сваёй старонкі, прыцягвае рэкламадаўцаў, атрымлівае грошы, але не нясе адказнасці ні за дакладнасць распаўсюджанай інфармацыі, ні за наступствы распаўсюджвання падману, не плаціць падаткі, — расказаў ён. — Вельмі правільна, што Палата прадстаўнікоў вынесла на абмеркаванне журналісцкіх арганізацый прапановы па змяненні Закона аб СМІ. Думаю, у пярвічных, абласных арганізацыях людзі выкажуцца з гэтай нагоды».

**Дзмітрый ПАРТОН, старшыня камітэта па прэміях і прафесійнай этыцы журналіста Беларускага саюза журналістаў, дырэктар дырэкцыі інтэрнэт-вяшчання СТБ**, заўважыў, што адставанне заканадаўства ад развіцця IT-тэхналогій было вельмі зручна некаторым медыя. Газета павінна адказваць на лісты, несці адказнасць за каментарыі наведвальнікаў свайго сайта. Разам з тым маса буйных інтэрнэт-рэсурсаў, дзе чытачоў непараўнальна больш, засталіся за бортам гэтых патрабаванняў і іх гэта задавальняе. Хоць еўрапейскі вопыт паказвае, што любыя медыя нясуць адказнасць за каментарыі, якія размяшчаюць».

Сродкі масавай інфармацыі павінны называцца сродкамі масавай інфармацыі, пагадзіўся з калегамі **медыяэксперт, аўтар кнігі, прысвечанай прафесійнай этыцы журналіста, Анатоль ГУЛЯЕЎ.**

— Іншая справа, што мне ў гэтых прапановах не падабаецца тое, што датычыцца рэгістрацыі... Бясспрэчна, журналісты павінны працаваць у прававым полі, і змяненні ў Закон аб СМІ павінны быць унесеныя, але, калі дзяржава робіць больш жорсткімі нейкія рамкі, калі незарэгістраваныя як СМІ інтэрнэт-рэсурсы, якія па факце такімі з'яўляюцца, не атрымліваюць акрэдытацыю, наўрад ці гэта правільна, — выказаў думку ён.

**Палітычны аглядальнік Белтэлерадыёкампаніі Андрэй КРЫВАШЭЕЎ** у сваю чаргу дадаў, што тэма знікнення ананімнасці ў каментарыях, якая актыўна абмяркоўваецца ў сувязі з прапанаванымі зменамі, надуманая. «Ніякай ананімнасці ў інтэрнэце быць не можа, усе, хто заходзяць у сеціва, не ананімныя. Трэба быць вельмі прасунутым у сучасных тэхналогіях чалавекам, каб захоўваць долю ананімнасці. Прычым, калі ўзнікне патрэба ў буйнога сеткавага рэсурсу выявіць месцазнаходжанне чалавека, гэта будзе зроблена дастаткова аператыўна», — сказаў журналіст.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Камунальныя стасункі

# БАТАРЭІ ЗАСТАЮЦЦА ЦЁПЛЫМІ, ПАКУЛЬ...

**Адключэнне ацяплення ў жылфондзе і на аб'ектах сацыяльнай і культурнай сферы ў Мінску пакуль не плануецца, магчыма, адпаведнае рашэнне будзе прынята да сярэдзіны красавіка, паведамляе намеснік старшыні Мінгарвыканкама Віктар ЛАПЦЕЎ.**

«Разглядаючы гэта пытанне, трэба выключна арыентавацца на ўмовы надвор'я», — лічыць намеснік старшыні. Калі сярэднясутачная тэмпература на працягу трох дзён пратрымаецца на ўзроўні плюс 8 градусаў і цяплей, тады і будуць падставы для адключэння. «Пакуль што такое рашэнне не прымалася, графік адключэнняў не складаўся. Думаю, гэта адбудзецца да сярэдзіны красавіка», — сказаў Віктар Лапцеў.

А ўсё ж такі, цяпло ў сталіцы эканомяць. Прынамсі, з чацвярга ў Мінску пачынаюць адключаць ацяпленне ў адміністрацыйных будынках і на прадпрыемствах. Адпаведнае рашэнне прынята ў Мінгарвыканкаме 4 красавіка.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Прагноз

# Сонечна і без дажджоў

## А ў панядзелак прыгрэе да плюс 22 градусаў

**Сапраўды камфортнае надвор'е чакаецца ў нас у гэтыя выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Надвор'е будзе «дыктаваць» антыцыклон, які перамесціцца з боку Заходняй Еўропы. Па начах будзе халаднавата, але ў дзённыя гадзіны пры невялікай воблачнасці чакаецца камфортная, без ападкаў, пагода. Уначы і раніцай у некаторых раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы ў суботу складзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, але ў нядзелю ўначы па паўднёвым захадзе яна не апусціцца ніжэй 4—5 цяпла. У суботу ўдзень чакаецца 10—15 цяпла, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 17 градусаў. У нядзелю будзе яшчэ цяплей, і тэмпература паветра ў другой палове дня складзе ад плюс 13 градусаў на паўночным усходзе да 20 цяпла на паўднёвым захадзе краіны.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку працоўнага тыдня захаваецца цёплае надвор'е. Заморазкі ўначы знікнуць зусім. У панядзелак будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, удзень чакаецца 15—22 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ЧАКАЕМ НАДВОР'Я ДЛЯ... КАРПА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта планы, а пакуль усё не так добра. З 20 найбуйнейшых спецыялізаваных рыбных гаспадарак маюць па мінулым годзе станоўчую рэнтабельнасць усяго сем. У чым справа?

На думку Наталлі Соніч, мінулагодні пачатак лета (май — чэрвень) быў значна халаднейшы за норму. У рыбных гаспадарках пачалі масава выкарыстоўваць камбікорм. І корм быў дарагі. Вось чаму па вытворчасці рыбы большасць комплексаў спрацавала ў мінус. У гэтым годзе спецыялісты чакаюць цёплай вясны і спрыяльнага лета. Акрамя таго, удалося зрабіць таннейшым камбікорм для рыб амаль на 50 %.



### Ікра чорная незамежная

У гіпермаркетах з'явілася чорная ікра ад аднаго нашага буйнога, але ўсё ж прыватнага вытворцы. Бляшанка 55 грамаў, ікра асятра. Па гусце ядрэнная. Ну і можна быць упэўненым, што ўсё ж ясі ікру асятра, а не нейкі сурагат.

За мінулы год два прыватныя прадпрыемствы вырабілі парадку 1300—1400 кілаграмаў чорнай ікры. Прадукцыю аднаго з беларускіх прадпрыемстваў па вытворчасці чорнай ікры прызналі найлепшай па якасці ў Расіі, паведаміла Наталля Соніч. «Адно з прадпрыемстваў заняло першае месца па якасці ікры ў Расіі, у іх ёсць адпаведны сертыфікат. Па іх словах, гэта рэнтабельна, улічваючы, што іх магутнасці на дадзены момант укамплектаваны толькі на 30 %», — расказала Наталля Соніч.

Па словах экспертаў, у Расіі прадукт атрымліваюць метадам сцэджвання, якасць ікры ў гэтым выпадку значна ніжэйшая. У Беларусі і заходніх краінах аддаюць перавагу забойнаму спосабу, хоць ён і больш затратны.

«Атрымліваецца яе забойным метадам: вырошчваюцца палаваспелыя самкі, іх адвозяць на паспяванне, пасля чаго — ікра і мяса ідуць на перапрацоўку», — растлумачыў **начальнік аддзела рыбалоўнай гаспадаркі і індустрыяльнага рыбаводства «Белвадгаса» Андрэй СЯРГЕЕЎ.**

Сабекошт гэтай рыбы значна вышэйшы, чым у карася або шчупака, бо не толькі мяса асятра ідзе на продаж, але і чорная ікра, якую з гэтых рыбін здабываюць. Уладальнік фірмы пад Мінскам прызнаецца, што «асятровы бізнес укладанняў патрабуе немалых, але і прыбытак уражвае. За кілаграм беларускай ікры замежныя пакупнікі плацяць каля дзвюх тысяч долараў».

Чорную ікру, зробленую ў Беларусі, ахвотна купляюць не толькі ў Расіі, але і ў Азербайджане і Казахстане. Партыя каштоўнага тавару адпраўлялася і ў краіны ЕС, але больш маштабная задача — забяспечыць беларусаў рыбапрадуктамі не самымі дарагімі, але не менш карыснымі, а гэта магчыма за кошт павелічэння аб'ёмаў вытворчасці.

### Каштоўны весланос

Усе вытворчыя выпрабаванні праводзяцца на адным з участкаў вытворчай базы пры Інстытуце рыбнай гаспадаркі — селекцыйна-племянным участку «Ізабеліна».

«Участак вельмі важны для нас: там цяпер завяршаецца будаўніцтва інкубатарнага цэха вытворчага комплексу, таму што мы плануем вырошчванне племянной прадукцыі ад вытворцаў чыстых пародных ліній для тыражавання, для рыбалоўных арганізацый і фермерскіх гаспадарак, для зарыблення натуральных вадаёмаў», — расказала **намеснік дырэктара па вытворчасці Інстытута рыбнай гаспадаркі Святлана БАНІНА.**

Па словах **начальніка ўчастка «Ізабеліна» Юрыя РУДОГА**, тут не толькі праводзяцца ўсе эксперыменты і адпрацоўваюцца новыя тэхналогіі, але і захоўваецца калекцыя амаль усіх відаў рыб, якія выкарыстоўваюцца ў беларускай прамысловасці; сярод іх — еўрапейскі сом, лінь, каля чатырох відаў асятровых. Вырошчваюць і спецыяльны від.

«Ёсць экзатычны від, ад якога мы зараз спрабуем атрымаць патомства, — гэта весланос (асятровы від). Яго можна выкарыстоўваць не толькі для вэнджання, але і для вырабу кансерваў для дзяцей», — растлумачыў Руды.

### Правіла «трох П»

Лепш за ўсё з рыбы ў нашай сям'і гатуецца і з'ядаецца фарэль і сёмга. Праўда, сям'я ў нас шматдзетная, таму часцей мы бяром больш бюджэтнага і, што галоўнае, мясцовага карпа.

Можна выкарыстоўваць і невялікія цэлыя рыбіны, але мае дзеткі не хочуць доўга перабіраць костачкі. Значыць, лепш узяць філе карпа. Зразумела, што страва будзе больш смачнай, калі яго выразаць непасрэдна са свежай рыбы, аднак не кожны з нас можа гэта рабіць сапраўды прафесійна і хутка.

Адразу нагадаю правіла «трох П» гатавання рыбы: пасаліць, паперчыць і палімоніць. Спачатку кавалачкі рыбы абмачаць у муцэ, пасля ва ўзбітых яйках і ў сухарах. Прычым не трэба шкадаваць ні яек, ні сухароў: ад гэтага залежыць, наколькі хрумсткай атрымаецца скурка, а гэта, як вядома, самая смачная частка рыбы. Выкласці падрыхтаванае філе ў разагрэтае топленае масла і на невялікім агні абсмажыць да прыгожага залацістага колеру. Адразу адкінуць на сурвэтку, каб увабралася лішняе масла, а затым падаваць як самастойную страву або з салатай.

Ад сябе асабіста дадам, што ў ідэале працуе правіла «чатырох П» — вядома ж, варта паесці. Мы гэта зрабілі — смак дзівосны...

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ «Еўрабачанне-2018»

# Восьмага мая пад нумарам восем

## Прадстаўнік Беларусі выступіць у сярэдзіне першага паўфіналу «Еўрабачання»



**Арганізатары міжнароднага песеннага шоу вызначылі чарговасць, у якой канкурсанты выйдуць на сцэну. У прыватнасці, прадстаўнік Беларусі, 24-гадовы ўкраінскі спявак Мікіта Аляксееў, з песняй «Forever» выступіць у першым паўфінале, 8 мая, восьмым па ліку.**

Нагадаем, у гэты дзень за 10 пуцёвак у фінал будуць спаборнічаць прадстаўнікі 19 краін (у парадку выступлення): Азербайджана, Ісландыі, Албаніі, Бельгіі, Чэхіі, Літвы, Ізраіля, Беларусі, Эстоніі, Балгарыі, Македоніі, Харватыі, Аўстрыі, Грэцыі, Фінляндыі, Арменіі, Швейцарыі, Ірландыі і Кіпра. Дарэчы, шэраг краін, якія выступаюць і галасуюць у першым паўфінале, ALEKSEEV і каманда артыста наведаюць у межах прома-туру.

Удзельнікі другога паўфіналу выступяць 10 мая ў наступным парадку: Нарвегія, Румынія, Сербія, Сан-Марына, Данія, Расія, Малдова, Нідэрланды, Аўстралія, Грузія, Польшча, Мальта, Венгрыя, Латвія, Швецыя, Чарнагорыя, Славенія і Украіна. Улічваючы, што першую з названых краін другі раз прадставіць этнічны беларус Аляксандр Рыбак, мы зможам хоць і не галасаваць, але маральна падтрымаць земляка. Тым больш, прамую трансляцыю абодвух паўфіналаў традыцыйна можна будзе паглядзець на каналах «Беларусь 1» і «Беларусь 24» або анлайн на сайце конкурсу eurovision.tv.

Фінальны канцэрт еўравізійнага шоу адбудзецца 12 мая і па старой завядзёнцы будзе складацца з выступленняў 20 найлепшых паўфіналістаў (па 10 з кожнага паўфіналу) і артыстаў з «вялікай пяцёркі» краін — арганізатараў шоу: Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Іспаніі, Францыі, а таксама гаспадыні конкурсу — Партугаліі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# Мінчане хочуць працаваць дырэктарамі

## IT не здае пазіцый

У канцы мінулага года сярэдні заробак па краіне амаль дасягнуў запаветных 500 доляраў і склаў 995 рублёў. Аднак у лютым 2018-га ўпаў да 850 рублёў. Праўда, да гэтай адзнакі дацягваюць не ўсе рэгіёны — толькі Мінск, Брэст, Наваполацк, Жодзіна, Салігорскі, Мінскі, Рэчыцкі, Дзяржынскі і Мазырскі раёны. Лідарам па заробках застаецца «сталіца шахцёраў» — тут у сярэднім атрымліваюць 1191 рубель. У пяцёрку раёнаў з самымі нізкімі даходамі ўвайшлі Ушацкі, Мсціслаўскі, Лёзненскі, Мёрскі і Шаркаўшчынскі. У апошнім, па афіцыйнай статыстыцы, работнікам у сярэднім плацяць 490 рублёў.

Згодна з Белстатам, самай прыбытковай сферай застаецца IT, дзе спецыялісты атрымліваюць 3,6 тысячы рублёў. Па дзве тысячы рублёў у месяц плацяць у галіне паветранага пасажырскага транспарту і ў дапаможнай дзейнасці ў сферы фінансавых паслуг і страхавання. Тысячу рублёў перавышаюць таксама заробкі ў горназдабываючай прамысловасці, на вытворчасці коксу і прадуктаў нафтаперапрацоўкі, хімічных прадуктаў, выпуску камп'ютараў і перыферыйнага абсталявання, у аптовым гандлі, гандлі матацыкламі і аўтамабілямі і іх рамонце, многіх кірунках транспартнай дзейнасці. «Па пяцьсот» (у эквіваленце), паводле афіцыйнай статыстыкі, маюць навукоўцы, выдаўцы, тэлевізійнікі, архітэктары.

Медыкам плацяць у сярэднім 676 рублёў, педагогам — 615, сацыяльным работнікам — 509. У нізе зарплатнага рэйтынга размясціліся бібліятэкары, супрацоўнікі архіваў і музеяў (494 рублі ў месяц), а таксама цырульнікі і работнікі салонаў прыгажосці (404 рублі).

## Неабходны медыкі і прадаўцы

Свабодных працоўных месцаў у краіне хапае — у Агульнарэспубліканскім банку вакансій налічваецца 59,6 тысячы прапаноў. Кожная пятая з іх — у Мінску. Вырасла патрэба ў рабочых прафесіях: калі на канец 2016 года доля такіх вакансій складала 49 працэнтаў, то на канец 2017-га — 58.

У топ-3 запатрабаваных прафесій традыцыйна ўваходзяць урач, кіроўца аўтамабіля і медыцынская сястра — больш за 2,4 тысячы прапаноў па кожнай са спецыяльнасцяў. Адчуваецца недахоп прадаўцоў і кухараў: для іх адкрыта 1400 і 900 вакансій адпаведна. У Мінскай вобласці сярод самых запатрабаваных прафесій значыцца апаратар машыннага даення, у Віцебскай і Брэсцкай — трактарыст-машыніст, у Гомельскай і Гродзенскай — ветэрынарны ўрач. А ў сталіцы пяцёрку актуальных вакансій замыкае прыбіральшчык памяшканняў.

Саіскальнікаў, у сваю чаргу, больш за ўсё цікавяць месцы падсобных рабочых, эканамістаў, грузчыкаў, бухгалтараў і кіроўцаў аўто. Мінчане часта шукаюць таксама вакансіі інжынера, дырэктара і менеджара, жыхары Мінскай вобласці — юрысконсульта і прадаўца, Віцебскай — прыбіральшчыка і дворніка, Брэсцкай — жывёлавода.

Колькі гатовы плаціць саіскальнікам? У 43 працэнтах выпадкаў прапануюцца заробкі, якія не перавышаюць 400 рублёў. Напрыклад, у Полацку на «мінімалку» (гэта 305 рублёў у месяц) шукаюць прадаўцоў, у Оршы на тыя ж грошы хочуць наняць кухара, а ў Магілёве — сталяра, рэжысёра-пастаноўшчыка і выхавальніка ў дзіцячы садок.

Прыкладна столькі ж вакансій (42 працэнты) — з заробкамі ад 400 да 699 рублёў. Ад 700 да 999 рублёў гатовы плаціць на адным з дзесяці свабодных працоўных месцаў. А больш за тысячу абяцаюць толькі 4 % вакансій.

## 20 тысяч рублёў для пілота

Што да рэкордна высокіх заробкаў, то ў рэспубліканскай базе ёсць дзевяць прапаноў, дзе гатовы плаціць пяць тысяч рублёў і больш. Усе яны — у сталіцы ці ваколіцах. Такую суму, напрыклад, прапануюць дырэктарам кампаній, што будуць знаходзіцца на тэрыторыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень» у Смалявіцкім раёне. З патрабаванняў — вышэйшая адукацыя, свабоднае валоданне кітайскай мовай, вопыт работы ў будаўніцтве і на кіруючай пасадзе ад трох (ці пяці) гадоў.

Кансалтынгавая кампанія шукае кіраўніка праекта. Каб заняць пасаду і мець 5600 рублёў у месяц, трэба добра ведаць англійскую і нямецкую мовы, мець вопыт работы ў сферы бізнес-паслуг за межамі Беларусі ад пяці гадоў. Плюс, пажадана, наяўнасць дыплома замежнага ўніверсітэта.

Сетка крам тавараў для дому гатова плаціць свайму менеджару 6100 рублёў. У задачах — развіваць электронную камерцыю. Што трэба? Мець вопыт у гэтай сферы мінімум два гады, разбірацца ў вэб-аналізе, валодаць англійскай і латышскай мовамі. Сюды ж шукаецца дырэктар на 17 тысяч рублёў у месяц.

Кіраўнік неабходны ў фінскую кампанію, якая аказвае бухгалтарскія і юрыдычныя паслугі. Кандыдат павінен мець 10-гадовы вопыт і ведаць англійскую, фінскую і шведскую мовы. Заробак такі ж высокі, як і патрабаванні — 7300 рублёў.

Адкрыта пасада дырэктара медыцынскай кампаніі. Плацяць 12,8 тысячы ў месяц. Каб уладкавацца, неабходны дыплом аб вышэйшай адукацыі ў галіне фармацэўтыкі, добры ўзровень англійскай мовы, вопыт работы кіраўніком не менш за пяць гадоў і ўпэўненыя навыкі карыстання камп'ютарам.

Самы вялікі заробак, які можна знайсці сёння ў рэспубліканскай базе вакансій, — у камандзіра паветранага судна. Пілоту «Белавія» абяцаюць 20 тысяч рублёў у месяц. У патрабаваннях да кандыдата ўказаны вышэйшая адукацыя, выдатная англійская мова і вопыт ад трох гадоў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ❍ Ёсць пытанне

### Што зменіцца ў Працоўным кодэксе?

Падчас вясенняй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь дэпутаты разгледзяць папраўкі ў Працоўны кодэкс. Вось толькі некалькі момантаў, якія будуць вынесены на абмеркаванне.

У дакуменце хочуць замацаваць паняцце «дыстанцыйная работа». З тымі, хто працуе аддалена, плануюць заключаць звычайны працоўны дагавор. Будуць дзейнічаць тыя ж нормы па рэгламентацыі працоўнага часу, часу адпачынку і атрыманні водпуску, што і ў работнікаў, якія шчыруюць на тэрыторыі наймальніка.

Тым, хто знаходзіцца ў водпуску, дазволяць на гэты час працаваць па сумяшчальніцтве поўны працоўны дзень. Гэтым правам змогуць карыстацца і работнікі, што знаходзяцца ў вымушаных водпусках па ініцыятыве наймальніка.

Наймальнікам, у сваю чаргу, дазволяць часова пераводзіць падначаленых (з іх пісьмовай згоды) на іншую работу ці на іншае прадпрыемства на тэрмін да шасці месяцаў на працягу года. Аплата пры гэтым будзе не ніжэйшай за сярэдні заробак на мінулым месцы.

Прапануюць замацаваць таксама нашумелы бацькаўскі дэкрэт. Работадаўцы абавязаны будуць забяспечваць мужчынам (па іх жаданні) кароткачасовы водпуск пры нараджэнні дзіцяці. Тэрмін такога водпуску — да 14 дзён. Заробак у гэты перыяд за татам захоўвацца не будзе.

# Як затрымаць спецыялістаў на вёсцы?

**У Віцебскай вобласці плануюць зрабіць многае, каб у глыбінцы хапала кадраў. У прыватнасці, каб стымуляваць працу жывёлагадоўцаў — цяперашніх і будучых, плануюць значна павысіць іх заробкі.**

## Льготы пры паступленні

Не сакрэт, што на вёсцы не хапае работнікаў, а ў некаторых раёнах і асобна ўзятых гаспадарках — катастрафічна. І праблемная сітуацыя тыповая для краіны. Моладзь у большасці сваёй імкнецца, як той казаў, «зачапіцца» ў буйных гарадах, у сталіцы. І многія выпускнікі ВНУ, інакш кажучы, «касцямі лягуць», а ў вёску не паедуць, ці пакінуць яе як толькі тэрмін адпрацоўкі скончыцца.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** сярод праблем недахопу кадраў адной з галоўных лічыць тое, што гарадскія абітурыенты, якія паступаюць, у прыватнасці ў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны, прыгарадны аграрны каледж, наўрад ці паедуць у глыбінку.

А насамрэч: бюджэтныя сродкі на навучанне трацяцца, а дзе вынік? Сёння толькі ў жывёлагадоўлі рэгіёна не хапае больш за 500 спецыялістаў.

Кіраўнік абласной вертыкалі ўлады бачыць рашэнне кадравай праблемы на вёсцы ў «бонуснай» сістэме пры паступленні для вяскоўцаў. Скончыўшы вучобу, яны паедуць туды, дзе ёсць сучасныя фермы і добры заробак. Упэўнены, калі на малой радзіме будуць плаціць у разы больш, чым гарадскім равеснікам, дык не пацягне ў горад.



## 1500 і болей рублёў у месяц

Ідэі, як павысіць заробкі на вёсцы, агучылі на сумесным пасяджэнні прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і аблвыканкама.

**Старшыня камітэта эканомікі аблвыканкама Анжаліка НІКІЦІНА** расказала пра нюансы таго, як вынікі працы паўплываюць на аплату: колькі змогуць зарабляць самыя запатрабаваныя спецыялісты, напрыклад, ветэрынарныя ўрачы, заатэхнікі і загадчыкі ферм, і пазнаёміла з «сеткай» лічбаў плануемых выплат па прагрэсіўнай шкале. Каб не ўдавацца ў дэталі, можна сцвярджаць, што, улічваючы прэміяльныя, зарплата ў цэлым можа дасягнуць 1500 і болей рублёў у месяц. Але і гэта не мяжа.

Прапанову абмяркуюць у раёнах, і пасля гэтага яна будзе зацверджана на абласным узроўні. Плануецца, што аналагічныя меры прадугледзяць таксама для даяркі і іншых працаўнікоў вёскі.

Паралельна можна будзе зацікавіць тых, хто з'язджае працаваць за мяжу. Гэтая праблема актуальная на Віцебшчыне, якая мяжуе з Расіяй.

Да таго ж, чаму б гараджанам не пераехаць у вёску, калі там можна зарабіць нават не пяцьсот долараў у эквіваленце, а значна больш? Дарэчы, за пяць гадоў на новае месца жыхарства дзеля работы перасялілі каля 350 сем'яў беспрацоўных.

## Адтэрміноўка для маладых спецыялістаў

На пасяджэнні прагучала вельмі цікавая прапанова аб тым, што для маладых аграрыяў, якія працуюць па размеркаванні, неабходна прадугледзець адтэрміноўку ад службы ў арміі. Ідэю губернатар давядзе да кіраўніцтва краіны. Ён упэўнены, што гэта будзе карысна і для войска. Асабліва тых часцей, дзе ёсць тэхніка.

### ❍ Да тэмы

**На Віцебшчыне пачынаюць эксперымент па падрыхтоўцы будучых кіроўцаў сельскагаспадарчых машын.**

Акцэнт зроблены на падрыхтоўку, якая адпавядае сучасным патрабаванням. Сярод задумanaga — цеснае супрацоўніцтва з вытворцамі тэхнікі. Галоўная мэта, каб хлопцы навучыліся карыстацца новай тэхнікай, што працуе ў полі.

— У прыватнасці, служыць прыйдзе не юнак, без вопыту эксплуатацыі тэхнікі, ды і жыццёвага, а чалавек з дарослай логікай, які ўжо пасталеў — такі падыход, — мяркуе губернатар.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**К публикации Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле № 4-А/2018, который состоится 20 апреля 2018 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 16 марта 2018 г. ) добавляется лот № 6 в следующей редакции:**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Затраты на подготовку документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | по ул. Оськина | 340100000007072556 | 0,0727 | Для строительства и обслуживания здания розничной торговли | Охранная зона сетей сооружений канализации, электрических сетей, объектов газораспределительной системы | 5 | 5 718,33 | 300,00 | 3 407,18 |

Лот № 6 выставляется на аукцион повторно, извещение опубликовано 17 февраля 2018 г. в газете «Звязда»

**Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.gomel.gov.by либо geodezcentr.by**

УНП 400230163

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» от 30 марта 2018 года, на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк» 13 апреля 2018 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

**Повестка дня**

Об утверждении изменений в Устав ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 30 марта 2018 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 2 апреля по 11 апреля 2018 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, региональные дирекции по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 11 апреля 2018 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка, филиалов, региональных дирекций по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 10 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 10.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551



**Извещение о проведении 20 апреля 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №7»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (местонахождение, наименование, характеристики продаваемого имущества)** | Расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Набережная, 8, «здание хозяйственно-бытовое» общей площадью 94,5 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-39667; составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание котельной В 1/к с двумя кирпичными пристройками Г1/к, 1);<br>расположенные по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, «артезианская скважина» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-40402; составные части и принадлежности: артезианская скважина 1.Г, состоящая из колодца над артезианской скважиной 1.1 г1, асфальтобетонной площадки 1.2 г2, ограждения 1.3 г3);<br>«железнодорожный тупик на прирельсовой базе» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-42933; составные части и принадлежности: железнодорожный тупик на прирельсовой базе протяженностью 109,0 м;<br>«мазутохранилище на 180 тонн» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-42791; составные части и принадлежности: кирпично-железобетонное мазутохранилище 1.Б с тамбуром технологическим 1.1 б1);<br>«мазутохранилище на 180 тонн» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-42792; составные части и принадлежности: металлическое мазутохранилище 1.А, с тамбуром технологическим 1.1 а1);<br>«битумохранилище на 750 тонн» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-42793; составные части и принадлежности: железобетонное битумохранилище на 750 тонн 1.В, с тамбуром технологическим 1.1 в1);<br>забор сетка рабица (инв. № бухг. 100130) |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 625450100001003819, площадь – 0,5249 га; назначение: для содержания и обслуживания прирельсовой базы |
| **Сведения о продавце** | ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (8017) 507-61-83 |
| **Сведения об организаторе торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62 |
| **Начальная цена предмета торгов (снижена на 70 процентов)** | 43 655,80 бел. руб. с учетом НДС |
| **Размер задатка** | 4 300,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 20 апреля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 09.04.2018 по 18.04.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(033) 333-80-52 (ОАО «ДСТ № 7»)





## НЕ РАБІ ДУРНОГА...

Вёска наша і была немалая, а потым яшчэ сто дамоў з'явілася: жодзінскія будаўнікі іх для перасяленцаў паставілі.

Але ж сёння многія хаты ўжо пустыя, дзіцячых галасоў не чуваць (хіба ў час канікул). А так — цішыня. Выйду калі на вуліцу, гляну ў адзін бок — нікога не відно, гляну ў другі — таксама. Кажу гаспадару: «Па вуліцы хоць голы бяжы — ніхто не ўбачыць!» Ён у адказ: «А ты паспрабуй — праз гадзіну ўся вёска даведаецца».

Што праўда, то праўда.

...Гэта было задоўга да праклятага Чарнобыля — мы тады на радзіме жылі. І непадалёк ад нас — самадур адзін. Гроб ён пад сябе, што толькі мог. У яго ў асабістай уласнасці нават... людзі былі: жонка, цешча, дачка. Усе трое ў яго ў кулаку, усе пад пятой і без права голасу. Хіба дзіця пабляжку мела ды і тое гады ў рады.

Дык вось у нашай сярэдняй школе праводзіўся чарговы выпускны. Жонка таго куркуля Марына Іванаўна (яна ж — настаўніца і класны кіраўнік) разам з іншымі рыхтавала той вечар, а ўрэшце і сама стала на яго збірацца, бо трэба ж: прычасалася хораша, трохі падмалявалася, прыбралася. Апошні раз зірнула ў люстэрка: усё ў парадку, як быццам? Бо і тварам, што называецца, выйшла, і дзявочы стан захавала, і сукенку ўдалую купіла, а ўжо туфлікі...

— Я пайду, — сказала свайму Васілю.

У мужа ад такога нахабства аж дух заняло, чарней хмары зрабіўся. І спыніць не можа, бо яна ж не на гулянку ідзе, а на працу. Толькі да каго вось гэтак прыбраўшыся?

У галаве ў раўнівага адна за адной сталі «праносіцца» самыя жудасныя карціны: вось яго Марыну запрашае на танец малады фізрук, штосьці шэпча ёй на вушка, прытуляе да сябе... Вось яна за сталом сядзіць плячо да пляча з аграномам, і ён ёй шампанскае лье... Вось яны ўдваіх на вуліцу ідуць падыхаць свежым паветрам...

Ад думак дах у мужчыны ехаў, ён места сабе не знаходзіў. І ўрэшце не вытрымаў, грукнуў кулаком па стале, закрычаў:

— Колькі можна гуляць?! Замужняя баба! Што яна сабе дазваляе?!

Маці гэтай «бабы» паклікала ўнучку. Ад бяды падалей яны выслізнулі з хаты, удзвюх прыйшлі да школы, ціхенька паклікалі Марыну Іванаўну, сказалі, што лепш ёй пайсці дамоў.

Жанчына і без слоў бы ўсё зразумела: тут жа (як ні цяжка было!) развіталася са сваімі выпускнікамі і калегамі, рушыла ў бок дома, тузанула за ручку дзверы.

Ды не тут тое было: зачынены. А гаспадар — у хаце.

Жанчыны пастукалі ў адну шыбу, у другую. Васіль — «не пачуў».

**1915** год — нарадзіўся (г. Віцебск) Фёдар Львовіч Шапіра, фізік-ядзершчык, член-карэспандэнт АН СССР, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар МДУ імя М. Ламаносава. Працаваў у Фізічным інстытуце АН СССР, намеснікам дырэктара Лабараторыі нейтроннай фізікі Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў. Аўтар навуковых прац па фізіцы рэактараў, ядзернай і нейтроннай фізіцы. Упершыню выявіў ультрахалодныя нейтроны і даследаваў іх уласцівасці. Удзельнік стварэння імпульснага рэактара на хуткіх нейтронах. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1973 годзе.




**1908** год — нарадзіўся Вано Ільіч Мурадэлі, грузінскі і расійскі кампазітар, народны артыст СССР. У 1938—1939 гадах — адказны сакратар Саюза кампазітараў СССР. У 1942—1944-м — начальнік і мастацкі кіраўнік Цэнтральнага ансамбля ВМФ СССР. Аўтар опер «Вялікая дружба», «Кастрычнік», аперэт «Дзяўчына з блакітнымі вачыма» і «Масква—Парыж—Масква», папулярных песень. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1970 годзе.

**1930** год — пастановай ЦВК СССР заснаваны ордэн Леніна і ордэн Чырвонай Зоркі.

**1933** год — нарадзіўся Станіслаў Андрэевіч Любшын, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст РСФСР. Здымаўся ў фільмах «Альпійская балада», «Шчыт і меч», «Не страляйце ў белых лебедзяў» і іншых.

**1945** год — падчас Усходне-Прускай аперацыі 1945 года пачалася Кёнігсбергская наступальная аперацыя войскаў 3-га Беларускага фронту (Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі) ва ўзаемадзеянні з Балтыйскім флотам.

**1953** год — у СССР было афіцыйна паведамлена аб спыненні так званай справы ўрачоў. Пачатак палітычнай «адлігі».

## УСМІХНЕМСЯ

**Новыя радары ДАІ паказваюць адразу ў рублях.**

Сустрэліся двое.

— Саша, хацеў у цябе спытаць. Задача вось якая...

— Пачакай, пачакай, табе параду ці кансультацыю?

— А ў чым розніца?

— Парада — бясплатная, кансультацыя — за грошы.

— Параду, вядома!

— Мая табе парада: запішыся на кансультацыю.

**У суседа — перфаратар, затое ў мяне — піяніна. Рамонты канчаюцца, а музыка вечная!**

— Вой, Вова, мне столькі грошай трэба! На эпіляцыю, манікюр, педыкюр, меліраванне, касметыку... Хоць разарвіся!

— Вось няшчасная! Затое як мне пашанцавала — адразу прыгожы нарадзіўся!

**Банк, з якога мяне звольнілі тры гады таму, купіў банк, у якім я працую цяпер, і мяне зноў звольнілі. Няўжо толькі дзеля гэтага і куплялі?**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1240.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 красавіка 2018 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

6 красавіка 2018 г. № 14 (447)




стар. 3

**Менш — не значыць горш**



стар. 13

**«Райская даліна» Таццяны**



стар. 15

**«Зялёны горад» Навагрудак**

ТЭМА ТЫДНЯ

# НЕВЯЛІКІ СЯМЕЙНЫ БІЗНЕС



**Фермер БАРУШКА лічыць сябе сярэднячком і паспяхова пераадольвае хваробы росту**

**Аляксандр Барушка — адзін з першых на Бярозаўшчыне, хто ўзяўся за фермерскую гаспадарку. Было гэта ў 2000 годзе. Цяпер Аляксандр Іванавіч з усмешкай згадвае сход, на якім прымалі рашэнне выдзеліць тры гектары калгаснай зямлі. Унутрана ён падрыхтаваўся пачуць нешта накшталт: «Першая ластаўка новай формы гаспадарання», а пачуў: «Першы адшчапенец». Што называецца, асадзілі з парога. Тады зразумеў, што давядзецца пераадольваць негатыўнае стаўленне, у пэўным сэнсе псіхалогію непрыняцця.**

## Першыя тры гектары

Цяпер яны з жонкай усе гэтыя з'явы называюць хваробамі росту. «Мы ведалі, на што ішлі,— падхоплівае размову Вера Віктараўна. — Галоўнай для нас была работа. Мы хацелі самі паспрабаваць атрымаць нейкі вынік, прымяніўшы веды і вопыт. Ну а праблемы? Яны ўвесь час былі і будуць, іх трэба вырашаць».

Аляксандр і Вера Барушкі пажаніліся падчас вучобы ў Горацкай сельгасакадэміі. У іх была магчымасць застацца ў ВНУ з улікам Вераніна чырвонага дыплома. Такое запрашэнне паступала... Але яны паехалі па размеркаванні на радзіму Аляксандра — у Бярозаўскі раён. На першае дзесяцігоддзе іх працы прыйшліся і развал Саюза, і розныяпературбацыі ў сельскай гаспадарцы. Правільней сказаць, працы Аляксандра Іванавіча, бо жонцы работу давялося сумяшчаць з дэкрэтнымі водпускамі: чацвёра дзяцей выгадавалі Барушкі.

Яшчэ ў 1989 годзе, на першай хвалі ўзнікнення кааперацыйнага руху, першых спроб прыватнай ініцыятывы Аляксандр з таварышам узялі ў арэнду калгасны сад. Але тады не атрымалася... Свой адбітак наклала менавіта негатыўнае стаўленне аднавяскоўцаў. Калгасны сад раней успрымалі як нічый альбо свой. Значыць, кожны, хто хацеў, браў там яблыкі ў любой колькасці. Садавіну можна было здаць нарыхтоўшчыкам, зварыць з яе варэнне ці пакласці ва ўласны склеп. І раптам — гаспадар, арандатар! Адным словам, давялося адмовіцца, хоць і высадзілі побач са старымі плантацыямі ладны кавалак маладога саду. Аднак ідэя пачаць сваю справу не пакідала. Той негатыўны вопыт паслужыў урокам. З часам, як ужо гаварылася, першыя тры гектары зямлі Барушкі атрымалі. Тады пасадзілі капусту і атрымалі нядрэнны ўраджай.

стар. 4

Валянціна КУРСЕВІЧ:

# «ДАПАМАГЧЫ КАНКРЭТНЫМ ЛЮДЗЯМ КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ»

**Жонка, маці, жанчына, гаспадыня, дэпутат, медык. Ці лёгка сумяшчаць усе абавязкі? Пра гэта і іншае карэспандэнт распытала намесніка старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, практыкуючага кардыёлага Валянціну КУРСЕВІЧ.**



***— Валянціна Вацлаваўна, вы балатаваліся ў дэпутаты па Заслаўскай выбарчай акрузе № 77, куды ўваходзяць аграгарадок Лясны і вёска Бараўляны, якія практычна зрасліся і ўяўляюць сабой «мегаполіс». У Бараўлянах таксама сканцэнтравана шмат медыцынскіх устаноў: рэспубліканскага, абласнога, раённага падпарадкавання. Па дапамогу сюды едуць людзі з усёй краіны. І вядома, неабходна шмат чаго вырашаць, каб камфортна адчувалі сябе не толькі мясцовыя жыхары, але і пацыенты, тыя, хто прыязджае іх наведваць. Што ўжо ўдалося зрабіць? І на што варта звярнуць увагу ў перспектыве?***

— Паколькі я сама ўрач, то зацікаўлена ў тым, каб аграгарадок Лясны і вёска Бараўляны працягвалі развівацца і ўладкоўвацца. У гэтым кірунку ўжо шмат зроблена. За апошнія гады ў добраўпарадкаванне населеных пунктаў укладзены значныя фінансавыя сродкі і матэрыяльныя рэсурсы. І вядома, сфера аховы здароўя будзе ўмацоўвацца і ў далейшым, пра што сведчаць канкрэтныя планы. У прыватнасці, у Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы ўзводзіцца тэрапеўтычны корпус на 180 месцаў. Аб'ект плануецца здаць у другім паўгоддзі 2018-га. Яго ўвод дазволіць палепшыць аказанне медыцынскай дапамогі жыхарам Мінскага раёна, дзе налічваецца больш як 220 тысяч насельніцтва. І колькасць жыхароў штогод павялічваецца амаль на 7 тысяч. Толькі ў адным Бараўлянскім сельсавеце пражывае 55 тысяч чалавек. Зразумела, што патрэбны дадатковыя магутнасці ў галіне медыцыны. Акрамя таго, прадугледжана ўдасканаленне спецыялізаванай дапамогі. З гэтай мэтай вызначаны, так бы мовіць, пункты на базе цэнтральных раённых бальніц: Бараўляны, Салігорск, Маладзечна і Барысаў, якія дазволяць павысіць якасць аказання медыцынскіх паслуг.

Змены датычацца літаральна ўсіх раздзелаў медыцыны: траўматалогія, неўралогія, кардыялогія і іншыя.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## 3D-тэхналогіі для стаматалогіі

*Міхаіл Мясніковіч падчас рабочай паездкі наведаў паліклініку*

**Урачы 12-й гарадской клінічнай стаматалагічнай паліклінікі даўно разгадалі сакрэт «галівудскай» усмешкі сваіх пацыентаў. Складнікаў усяго два: прафесіяналізм спецыялістаў і якаснае абслугоўванне. Пра работу калектыву і навоўвядзенні старшыні Савета Рэспублікі расказаў галоўны ўрач паліклінікі Уладзімір Краўчонак. Як на практыцы ідуць справы, Міхаіл Мясніковіч пацікавіўся ў пацыентаў, якія адзначылі выдатныя суадносіны «цана — якасць» на платныя паслугі.**

12-я гарадская — адзіная паўнапрофільная стаматалагічная паліклініка ў Першамайскім раёне Мінска. З 2008-га да 2010 года ўстанова прайшла маштабную рэканструкцыю. Пасля знешняга абнаўлення змены закранулі і матэрыяльна-тэхнічную базу, і кадры.

— За гэты перыяд мы за пазабюджэтныя сродкі купілі камп'ютарны тамограф, які сёння з'яўляецца залатым стандартам дыягностыкі. Вельмі добра ў паліклініцы развіта імплантацыя. Мы ставім каля 700 імплантаў у год. Сярод дзяржаўных устаноў у гэтай сферы мы з'яўляемся лідарамі. У паліклініцы вырабляюцца ўсе віды зубных пратэзаў, аказваюцца ўсе стаматалагічныя і тэрапеўтычныя паслугі з поўным наборам матэрыялаў, інструментаў, тэхналогій, якія сёння ёсць у стаматалогіі свету, — расказаў Уладзімір Краўчонак.

Цяпер галоўнае жаданне медыкаў — свой 3D-прынтар, які адкрые новыя магчымасці для пашырэння спектра паслуг.

## Унёсак для малой радзімы

*Мар'яна Шчоткіна ўзяла ўдзел у семінары-нарадзе ў Кобрыне*

**Грамадзянская супольнасць павінна прымаць актыўны ўдзел у развіцці малой радзімы. Пра гэта заявіла намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мар'яна Шчоткіна падчас абласнога семінара-нарады па пытаннях жыццезабеспячэння насельніцтва і павышэння якасці жыцця ў 2018 годзе ў Кобрыне.**

«Мясцовыя ўлады павінны сканцэнтраваць усе намаганні для павышэння якасці жыцця насельніцтва. Дробязей у гэтым пытанні няма. Але выніку можна дасягнуць толькі сумеснымі намаганнямі, уключаючы грамадзянскую супольнасць. Малая радзіма для кожнага з нас мае асаблівае значэнне. Важна, каб людзі самі прымалі ўдзел у яе развіцці», — падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна.

## Паспяховае партнёрства

*Парламенцкая дэлегацыя правяла перагаворы ў Кітаі*

**Члены Савета Рэспублікі ў складзе парламенцкай дэлегацыі, што наведала на мінулым тыдні КНР, сустрэліся з намеснікам дырэктара Дэпартамента камерцыі кітайскай правінцыі Хубэй Юн Яцэ. Былі абмеркаваны пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, умацавання міжпарламенцкіх сувязяў.**

Юн Яцэ праінфармаваў пра дзейнасць кампаній правінцыі ў Беларусі ў рамках Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». У прыватнасці, гаворка ішла аб забудове галоўнага адміністрацыйнага комплексу парка, а таксама аб планах кітайскага бізнесу па стварэнні ў Беларусі лагістычнага цэнтра.

Акрамя таго, Беларусь і Кітайская правінцыя Хубэй дамовіліся пашыраць супрацоўніцтва. Адпаведная дамоўленасць дасягнута па выніках сустрэчы парламенцкай дэлегацыі Беларусі з намеснікам старшыні Пастаяннага камітэта Сходу народных прадстаўнікоў правінцыі Хубэй Ван Лін.

Правінцыя Хубэй зацікаўлена ў сумесных з беларускім бізнесам праектах у сферы машынабудавання, транспарту, металургіі, вытворчасці лазернага абсталявання. «Наша правінцыя — буйны цэнтр машынабудавання Кітая, дзе вырабляецца больш за 3 млн адзінак аўтатранспарту ў год, — адзначыла намеснік старшыні Ван Лін. — Прыкладам паспяховага партнёрства з Беларуссю ў прамысловасці стала стварэнне сумеснага прадпрыемства «Волат-Санцзян», якое спецыялізуецца на выпуску гідраўлічнага абсталявання. Хацелася б, каб такіх праектаў было больш». Сярод магчымых напрамкаў супрацоўніцтва былі названы чыгуначны транспарт, сельская гаспадарка, навука, адукацыя, культура, турызм.

**Марыя ДАДАЛКА, Вераніка ПУСТАВІТ.**

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ!

# Мы разумеем сваю адказнасць

**У Магілёўскай вобласці склад кіраўнікоў раённых саветаў дэпутатаў абнавіўся на дзве трэці. Свае веды і арганізатарскія здольнасці тут рэалізуюць лідары з розных сфер дзейнасці. Шмат дзе гэтую пасаду занялі былыя намеснікі старшынь выканкамаў. У кожнага назапашаны карысны кіраўніцкі досвед, ёсць веданне балючых месцаў раёна і жаданне зрабіць аграгарадкі і вёскі яшчэ больш прыгожымі і прыдатнымі для жыцця. Нашы суразмоўнікі ахвотна падзяліліся з «МС» планамі на найбліжэйшую будучыню.**

— Справа гэта для мяне новая, таму зараз актыўна асвойваю ўсё, што трэба ведаць, — запэўнівае **старшыня Асіповіцкага раённага Савета дэпутатаў Сяргей СУВЕЕЎ,** які раней працаваў у сістэме адукацыі. — І мне, дарэчы, у гэтым дапамагае «МС». Чытаю газету ад першага да апошняга радка. Па сваёй дэпутацкай справе мы ўжо шмат чаго зрабілі. Правялі арганізацыйныя сесіі (у нас 11 сельсаветаў), абралі старшынь, іх намеснікаў, зацвердзілі планы работы на 2018 год. Зараз займаемся стварэннем органаў тэрытарыяльна-грамадскага самакіравання. Прыводзім у належны выгляд пасля зімы населеныя пункты, асабліваю ўвагу ўдзяляем могілкам, прыборцы смецця, рамонту кантэйнерных пляцовак, аднаўляем дзе трэба агароджу.

Плануем праводзіць выязныя мерапрыемствы. У другім квартале, напрыклад, збіраемся наведаць дзіцячую школу мастацтваў № 1, паглядзець, як там ідуць справы. У нас ёсць дэпутат, які мае дачыненне да гэтай школы. Яшчэ адзін дэпутат прапанаваў правесці выязное пасяджэнне ва ўстанове «Маяк», дзе ён працуе. І гэта ў нас таксама ў планах, бо трэба, каб дэпутаты лепш ведалі эканамічны і культурны патэнцыял свайго раёна. Людзі прыйшлі з розных галін, ім карысна паглядзець, як усё функцыянуе ў цэлым. У нас і сельская гаспадарка развітая, і прамысловасць, і чыгунка... Але адна справа — пачуць, і зусім іншая — убачыць.

Слаўгарадскі раён добра вядомы сваімі праектамі па арганізацыі самазанятасці насельніцтва. Гэтым вопытам **старшыня Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў Святлана ЯЗЕРСКАЯ** дзялілася нават з удзельнікамі выязнога пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі ў Магілёве.

— У нас добры вопыт работы па Дэкрэтах № 3 і № 1. Працуем з сацыяльна небяспечнымі асобамі, садзейнічаем развіццю прадпрымальніцтва, дапамагаем насельніцтву рэалізоўваць праекты. Трэба, каб людзі затрымліваліся ў раёне, працавалі, каб павялічваліся іх даходы, — кажа яна.

Да назначэння на новую пасаду Святлана Язерская працавала намеснікам старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях.

— Папярэдняя мае абавязкі дзесьці пераклікаліся з цяперашнімі, — прызнаецца дэпутат. — Інфармаванне насельніцтва і работа з ім — гэтым і раней я займалася. На сустрэчах з дэпутатамі размаўляем пра іх дзейнасць у акругах, каб яны маглі арганізаваць работу на месцах, трымалі цесную сувязь з насельніцтвам, органамі мясцовага самакіравання. Па максімуме трэба сканцэнтраваць сілы на добраўпарадкаванні, навядзенні парадку пасля зімы. Надвор'е надштурхоўвае. Супала так, што вясна сёлета позняя, а Радаўніца ранняя — будзем працаваць

У аграгарадку практычна няма дома, дзе не было б гусей. А раней вёска была ўся «гусіная». У нас там нават Гусінае свята восенню праводзіцца.

У Бялыніцкім раёне дэпутаты таксама збіраюцца ў знамянальны для малой радзімы год зрабіць нешта карыснае на месцах.

— Звернем увагу на эстэтыку, стварэнне нейкіх архітэктурных формаў, — удакладняе **старшыня Бялыніцкага раённага Савета дэпутатаў Андрэй ГАНЧУК.** — На гэтым тыдні, напрыклад, пры фінансавай дапамозе тутэйшага СПК «Калгас «Радзіма» навадзілі парадак у аграгарадку Вішоў. Высеклі кустоўе, зрабілі абрэзку дрэў, падраўнялі агароджу. Наогул працы ў раёне шмат. Асобна займаемся абследаваннем калодзежаў. Яшчэ адзін важны кірунак — удасканальванне работы па закупе малака ў насельніцтва. Гэта і нейкая матэрыяльная падтрымка мясцовым жыхарам, і адначасова карысць для раёна. Трэба зрабіць так, каб не было замінак са зборам малака, выплатай грошай людзям. Каб у іх была матывацыя займацца павелічэннем пагалоўя буйной рагатай жывёлы.



аператыўна. Адначасова рыхтуемся да Сырнага фэсту, ён ужо хутка — 29 красавіка. У ім удзельнічаюць нашы падсобныя гаспадаркі, сыравары. Ужо створаны штаб па падрыхтоўцы да гэтага свята, абмяркоўваем планы.

— Збіраемся актыўна выконваць праграму навядзення парадку на зямлі, — дзеліцца планамі **старшыня Касцюковіцкага раённага Савета дэпутатаў Мікалай ПЛАТОНАЎ.** — Сёлета Год малой радзімы, і мы збіраемся зрабіць нешта адметнае ў кожным сельсавеце. У Белай Дуброве, напрыклад, старшыня сельскага Савета прапанаваў устанавіць малую скульптурную форму. Думаем стварыць кампазіцыю з дзяўчынкай, якая гоніць гусей на рэчку.

Наш тэлефонны званок застаў **старшыню Чэрыкаўскага раённага Савета дэпутатаў Анжэлу НОВІКАВУ** ў дарозе.

— Вывучаем тыя пытанні, якія патрабуюць хуткага вырашэння, — коратка растлумачыла яна. — У сувязі з гэтым правялі некалькі сходаў, узялі на кантроль жыццёва важныя пытанні грамадзян. Збіраемся пераглядзець і ўдасканаліць работу па навядзенні парадку. І дзейнічаць трэба неадкладна, бо лічаныя дні застаюцца да праваслаўных свят. Будзем паслядоўна выконваць усе тыя задачы, якія стаяць перад намі. Мы вельмі добра ведаем, якая адказнасць ляжыць на нас перад выбаршчыкамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

СМЕЦЦЕВАЯ СТРАТЭГІЯ

# АДХОДЫ — У ЦЯПЛО, СВЯТЛО І ЭНЕРГІЮ

**Не менш як палову камунальных адходаў Беларусі мяркуюць перапрацоўваць у 2035 годзе. Гэта мэта Нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі (ЦКА) і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі (ДМР). Каб дасягнуць заяўленых паказчыкаў, неабходна ўкараненне новых тэхналогій — энергетычнага выкарыстання і біялагічнай апрацоўкі адходаў, мадэрнізацыя палігонаў і ўкараненне дэпазітна-залогавай сістэмы збору ўпакоўкі.**

Існуючая сістэма раздзельнага збору смецця дазваляе за год збіраць 30 % шклянОй і 20 % пластыкавай тары ад агульных аб'ёмаў упакоўкі, якія рэалізуюцца на рынку. Пры гэтым замежны вопыт працы такіх сістэм паказвае, што дзякуючы ім для паўторнага выкарыстання рэальна можна збіраць 80—90 % упакоўкі.

— Падобных паказчыкаў дасягнуць цяжка, аднак дзве трэці беларусаў, як паказваюць апытанні, гатовыя ўдзельнічаць у такой сістэме. Мяркуецца, яна запрацуе ў Беларусі ў 2020 годзе. Пакуль вядуцца падрыхтоўчыя мерапрыемствы, — расказала **Надзея ТАТАРЫНЦАВА, намеснік дырэктара ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Пры гэтым аператарам ці адміністратарам дэпазітна-залогавай сістэмы прынцыпова будзе некамерцыйная арганізацыя, створаная толькі для кіравання сістэмай.

Кампенсацыя за раздзельна сабраную другасную сыравіну летась склала крыху больш за 32 млн рублёў. Сёлета на гэта дзяржавай прадугледжана 45,3 млн рублёў.

Увядзенне сістэмы разам з удасканаленнем і развіццём існуючай сістэмы абыходжання з другаснымі рэсурсамі праз закупку тэхнікі, будаўніцтва кантэйнерных пляцовак, стварэнне дадатковых магутнасцяў па сартаванні дазволіць выбраць з камунальнага смецця 25—30 % сыравіны для другаснага выкарыстання, упэўнена спецыяліст. Разам з тым паралельна трэба мадэрнізаваць месцы захавання адходаў з рэкультывацыяй і будаўніцтвам новых палігонаў і закрыццём мініпалігонаў, якія не адпавядаюць сучасным патрабаванням бяспекі.

— Далейшае павелічэнне выкарыстання цвёрдых адходаў магчыма толькі шляхам прымянення новых тэхналогій: энергетычнага выкарыстання і біялагічнай апрацоўкі адходаў. Ужо распачаты пілотны праект у Гродне па вытворчасці альтэрнатыўнага РДФ-паліва са смецця для выкарыстання яго на цэментных заводах, — дадала Надзея Татарынцава. — Па выніках будзе прымацца рашэнне аб павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці, у тым ліку і ў іншых рэгіёнах.

Найвастрэй праблема па выкарыстанні адходаў паўстае перад Мінскам. Тут утвараецца найбольш смецця, а магутнасцяў палігонаў не хапае. Дапамагчы сталіцы можна, стварыўшы тут завод па спальванні адходаў магутнасцю 500 тысяч тон на год з вырабам цеплавой і электрычнай энергіі. На яго будаўніцтва прадугледжана 300 млн еўра.

**Ірына СІДАРОК.**

# «Дапамагчы канкрэтным людзям канкрэтнымі справамі»

На базе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава ў Бараўлянах планунецца ўвесці ў дзеянне гасцініцу для людзей, якія прыехалі здалёк і не паспелі зрабіць абследаванне за адзін дзень. Яны змогуць тут спыніцца. Вельмі актуальным застаецца пытанне забеспячэння жыллём работнікаў аховы здароўя. У вёсцы Ляскоўка планунецца будаўніцтва трох дамоў для медыкаў Мінскага раёна. У перспектыве мяркуецца рэканструяваць аб'екты нерухомасці, якія не выкарыстоўваюцца, пад інтэрнаты для работнікаў аховы здароўя.

Разам з тым, будуць будавацца дзіцячыя сады, школы. У той жа Ляскоўцы з 1 верасня 2018 года адкрыецца новая школа на 720 месцаў.

***— Вы па прафесіі медык, але людзі звяртаюцца да вас не толькі па пытаннях аховы здароўя...***

— Так, на першым месцы — праблемы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, на другім — рамонт і рэканструкцыя дарог, затым сацыяльная сфера, ахова здароўя, адукацыя.

У сельскіх Саветах дэпутатаў мы вядзём прыёмы па асабістых пытаннях грамадзян. Папярэдне за два-тры дні да пачатку вывешваем аб'явы, каб чалавек мог своечасова сарыентавацца. Людзі прыходзяць з рознымі пытаннямі. Што датычыцца Заслаўя, то жыхароў хвалюе будаўніцтва новых бальніцы і паліклінікі. У сувязі з гэтым правялі сустрэчу з медработнікамі Мінскага раёна, у якой прымалі ўдзел начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама Наталля Баярская, намеснік старшыні Мінскага раённага выканаўчага камітэта Аляксандр Мякіннік. У інвестыцыйную праграму цэнтральнага рэгіёна на 2018 год унесены будаўнічы праект, архітэктурныя ўжо падрыхтаваны.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***




На парадку дня таксама пытанне якасці вады ў Мінскім раёне. Да 2020 года планунецца пабудаваць станцыю абезжалезвання ў Заслаўі.

> Кожны жыхар Беларусі павінен мець права на якасную, даступную і своечасовую медыцынскую дапамогу. Здаровая нацыя — значыць, моцная сям'я, і адсюль квітнеючая дзяржава.

У гэтым населеным пункце мы сустракаліся таксама з жыхарамі мікрараёна Хмелеўка па пытаннях добраўпарадкавання. У выніку на вуліцы Анусінскай з'явілася цвёрдае пакрыццё. Распрацаваны план асфальтавання і ўладкавання іншых вуліц. Неадназова праводзіць сустрэчы з жыллёва-камунальнымі службамі, водаканалам Мінскага раёна па добраўпарадкаванні ваеннага гарадка Аколіца, які знаходзіцца на тэрыторыі Астрашыцкагарадоцкага сельсавета. І нават разам правялі суботнік. Ужо ўнесены пэўныя карэктывы ў капітальны рамонт дамоў, упарадкаванне тэрыторый. Пытанні, якія падымаюць на прыёмах грамадзяне, наколькі гэта магчыма, імкнёмся вырашаць. Да мяне звярталіся людзі, якія шмат гадоў працуюць ва ўстановах аховы здароўя, з просьбай пасадзейнічаць — аднавіць аўтобусны прыпынак каля садовага таварыства «Узгор'е». З дапамогай кіраўніцтва «Мінаблдарбуда» ў чэрвені аб'ект увялі ў дзеянне. З аналагічнай праблемай пасля будаўніцтва кальцавой дарогі сутыкнуліся і жыхары вёскі Траскоўшчына. У планах на 2018 год прадугледжана будаўніцтва прыпыначнага пункта і ў гэтай вёсцы.

***— Дапамога канкрэтным людзям канкрэтнымі справамі ўмацоўвае аўтарытэт народнага абранніка. Але ж ваша камісія робіць нямала ўнёсак ва ўдасканаленне заканадаўства па ахове здароўя, умацаванні сямейных адносін, развіцці фізічнай культуры. Што новага апошнім часам з'явілася ў гэтай сферы?***

— У 2017 годзе наша камісія працавала над законапраектам па аказанні дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. У законапраект уносіліся дапаўненні і змяненні некалькі гадоў таму — дэпутатамі пятага склікання. Асноўная ўвага тады ўдзялялася мерам па стымуляванні нараджальнасці: пры з'яўленні ў бацькоў другога, трэцяга і наступнага дзіцяці. Гэта дало свой плён: у 2016 годзе ў Беларусі ўпершыню нараджальнасць перавысіла смяротнасць. Змяненні, якія мы прапанавалі летась, датычыліся падтрымкі найбольш неабароненых у сацыяльных адносінах груп насельніцтва: сем'яў, дзе бацькі-інваліды выхоўваюць дзяцей, і тых сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Раней жанчыны, якія сталі на ўлік у тэрмін да 12 тыдняў цяжарнасці ў дзяржаўных установах, мелі правы на атрыманне дапамогі па цяжарнасці і родах. Зараз такім правам карыстаюцца і будучыя маці, якія стаяць на ўліку ў недзяржаўных установах аховы здароўя. Гэта, лічу, вельмі важны пункт. Другі значны законапраект, які прымалі, датычыцца фізічнай культуры і спорту. Сюды ўвайшлі многія змяненні і дапаўненні па функцыях валанцёраў, сцюардаў і іншае.

Сёлета камісія будзе працаваць над законапраектам аб донарстве. Дакумент скіраваны на прыярытэт бясплатнага донарства ў Рэспубліцы Беларусь. Надзвычай актуальны і законапраект аб трансплантацыі органаў і тканак. У 2017 годзе праведзена звыш 500 аперацый. І тут, канешне, мае вялікае значэнне юрыдычны бок пытання. На чарзе таксама абмеркаванне Кодэкса аб сям'і і шлюбе.

***— Што, на вашу думку, галоўнае ў сферы аховы здароўя?***

— Кожны жыхар Беларусі павінен мець права на якасную, даступную і своечасовую медыцынскую дапамогу. Здаровая нацыя — значыць, моцная сям'я, і адсюль квітнеючая дзяржава. Далёка хадзіць не трэба: па статыстыцы колькасць людзей, якія вядуць здаровы лад жыцця, штогод павялічваецца. Кожны чацвёрты беларус займаецца фізкультурай і спортам. І гэта неабходна прапагандаваць. Хваробу лягчэй прадухіліць, чым затым лячыць. Тым больш што на гэта трацяцца шмат дзяржаўных грошай. Прафілактычная работа павінна пачынацца з падлеткаў, моладзі, школьнікаў. Іх варта накіроўваць на тое, што яны не павінны сядзець толькі за падручнікамі. Вядома, вучэбныя праграмы складаныя, і кіраўнік дзяржавы паставіў задачу іх перапрацаваць, адаптаваць да новых эканамічных умоў. Разам з тым, трэба, каб фізкультура была пад асаблівым кантролем. Для гэтага ў нашай краіне робіцца шмат, укладваюцца вялікія матэрыяльныя і фінансавыя сродкі. Не кожны чалавек стане спартсменам, але весці здаровы лад жыцця павінны ўсе.

***— Валянціна Вацлаваўна, пра вас вельмі цёпла адгукаюцца людзі: кажуць, вы вельмі ўважлівая і чула ставіцеся да пацыентаў, у палату заходзіце з усмешкай... Але не ўсе вашы калегі паводзяць сябе так. Чаму?***

— Медыцыну трэба любіць, сюды не павінны трапляць выпадковыя людзі. Гэта маё асабістае меркаванне. Акрамя экзаменаў, якія здаюць абітурыенты, неабходныя псіхалагічныя тэсты, каб даведацца наколькі ім уласцівы такія чалавечыя якасці, як спачуванне, пачуццё суперажывання, цярплівасць, уменне выслухаць, падтрымаць, падбадзёрыць, супакоіць хворага. Такія рысы характару вельмі важныя для будучага медыцынскага работніка. Не важна, гэта ўрач з вышэйшай адукацыяй або медсястра, санітарка. Ад уважлівага стаўлення з іх боку залежаць настрой і здароўе пацыентаў. Вядома, усе мы людзі са сваімі праблемамі: бытавымі, сямейнымі. Але, калі вы прыходзіце на работу, то павінны пакінуць усе непрыемнасці за парогам.

***— Вы чалавек заняты: сустрэчы з выбаршчыкамі, сесіі, нарады, работа. Не крыўдуюць вашы сямейныя, што вы мала ўдзяляеце ім увагі?***

— У маёй сям'і ўсе ўрачы. Муж рэаніматолаг, сын — хірург-анколаг, нявестка — кардыёлаг. Таму мяне разумеюць, падтрымліваюць і ідуць насустрач.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

РАЗГЛЕДЗЕЛІ НА СЕСІІ

# МЕНШ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ ГОРШ

**Сёлета на Віцебшчыне запланавалі завяршыць аптымізацыю ўстаноў сістэмы адукацыі. Менавіта гэтае пытанне было ў цэнтры ўвагі на сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў.**

## РАЦЫЯНАЛЬНЫ ПАДЫХОД

Тэма хвалюе многіх жыхароў глыбінкі. Калі закрываюць школу ў вёсцы або сельская сярэдняя школа становіцца базавай, канешне, людзей гэта не радуе. Але ж што рабіць, калі вучні ў дэфіцыце? І штогод іх колькасць скарачаецца...

А пры гэтым трацяцца вялікія сумы на зарплаты настаўнікам, іншым работнікам, на аплату камунальных паслуг, рамонт і гэтак далей.

**Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ**, дарэчы, нагадаў народным абраннікам, што на пачатку аптымізацыі было нямала незадаволеных. Многія часта не разумелі, навошта гэта рабіць. Але ж час паказаў, што быў выбраны правільны «вектар», бо закрываюць або рэарганізуюць толькі бесперспектыўныя ўстановы.

Сэканомленыя сродкі традыцыйна накіроўваюцца выключна на патрэбы адукацыі. Такім чынам паляпшаюцца ўмовы ў іншых школах, садках.

Як адзначыў **начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама Дзмітрый ХОМА,** за апошнія два гады, дзякуючы аптымізацыі, істотна павялічылася напаўняльнасць класаў у некалькіх раёнах, а паралельна змяншаецца кошт навучання аднаго вучня ў год.

— Увогуле, працу па эканоміі выдаткаў нельга ацэньваць толькі па закрыцці і рэарганізацыі ўстаноў. Гэта — комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на аптымізацыю работнікаў, колькасці класаў, падгруп, класаў з музычнай накіраванасцю, на эканомію ад энергазберагальных мерапрыемстваў. Эфектыўнасць праведзенага — найважнейшы паказчык, — разважае Дзмітрый Хома.

Каб вазіць школьнікаў на заняткі, толькі летась купілі каля 60 аўтобусаў. А для тых хлопчыкаў і дзяўчынак, якім ездзіць вучыцца далёка, стварылі пришкольныя інтэрнаты. Яны ёсць ужо ў 15 з 21 раёна Віцебшчыны.

## З МІНУЛАГА Ў БУДУЧЫНЮ

Школы ў глыбінцы і надалей будуць аптымізавацца. Напрыклад, на сесіі было агучана, што 37 будынкаў устаноў адукацыі з'яўляюцца непрыстасаванымі, 10 — у аварыйным стане. У больш чым 10 школах для ацяплення выкарыстоўваюць печы. А ў некалькіх — прыбіральня ў двары.

Будынкі не проста зачыняюць, а старающца выкарыстоўваць у новых мэтах. Для гэтага іх прадаюць на аўкцыёнах, і з 2010 па 2017 год больш за 90 купілі. Запланавана ўцягнуць у гаспадарчы абарот яшчэ 147 будынкаў. І ўсё больш прыкладаў, калі ў экс-школах арганізуюць новую вытворчасць. Дарэчы, школу можна набыць і пад жыллё.

Пра эфект ад аптымізацыі гаварылі і дэпутаты.

**Старшыня Браслаўскага раённага Савета дэпутатаў Ніна ПУЧЫНСКАЯ** расказала пра вопыт раёна. Там, дарэчы, напаўняльнасць вучнямі ў сельскай мясцовасці прыкладна ў два разы меншая, чым у райцэнтры. Але і ў Браславе школы запоўнены не па поўнай, як той казаў. Ніна Пучынская лічыць, што закрываць школы, дзе вельмі мала вучняў, мэтазгодна. У выніку аптымізацыі на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы існуючых школ ужо накіраваны сотні тысяч рублёў.

А **старшыня Верхнядзвінскага райсавета дэпутатаў Ірына КОЗЕЛ** паведаміла пра магчымасць для развіцця сістэмы адукацыі выкарыстоўваць сродкі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця.

Дарэчы, у кожным раёне да 2022 года з'явіцца не менш за адну «Школу будучыні». Па абсталяванні яны павінны адпавядаць патрабаванням веку «высокіх тэхналогій». Яскравым прыкладам можна назваць СШ № 1 г. Дубровна, дзе адпаведны праект ужо рэалізаваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ПОЛЕ БЕЗ БАР'ЕРАЎ

## Дзяржава бачыць перспектывы ў падтрымцы фермерскіх гаспадарак

**Фермерскі сектар з'яўляецца адным з тых, што дынамічна развіваюцца ў аграрнай сферы. Практычна штогод тут забяспечваецца прырост вытворчасці прадукцыі, дасягаюцца высокія паказчыкі. На дзяржаўным узроўні лічаць перспектыўным гэты кірунак і ствараюць клімат, які паспрыяў бы развіццю гаспадарак фермераў. Разам з тым удзельная вага прыватнага бізнесу на палях краіны застаецца невялікай.**

### На будучае

Зараз у складзе аграпрамысловага комплексу Беларусі фермерскія гаспадаркі з'яўляюцца самай масавай недзяржаўнай арганізацыйна-прававой формай сельскай гаспадаркі. На 1 студзеня 2018 года ў нашай краіне іх зарэгістравана больш за 3,1 тысячы. Для параўнання: гэта на 3,3 % больш, чым у аналагічным перыядзе мінулага года. Павялічваецца і агульная плошча зямель у фермерскім сектары. За перыяд з 1995-га па 2017 год яна стала большай у 3,3 раза (на 144,4 тысячы га).

Як адзначылі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, сёння асноўным напрамкам вытворчай дзейнасці фермерскіх гаспадарак з'яўляецца раслінаводства. На яго долю прыпадае каля 90 % ад усёй прадукцыі, якую вырабляюць фермеры. Пры гэтым практычна ў палове прыватных гаспадарак вядучым кірункам з'яўляецца вытворчасць збожжа. Вырошчваннем бульбы займаюцца 12 % прыватнікаў, і каля 9 % — вытворчасцю агародніны.

Нягледзячы на высокія тэмпы прыросту вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі ў фермерскім сектары, удзельная вага яго ў агульнай вытворчасці застаецца нязначнай і складае крыху больш за 2 %. Аднак у краіне, арыентуючыся на паспяховы замежны вопыт, бачаць перспектывы развіцця гэтага напрамку і працягваюць ствараць больш зручныя ўмовы для фермерства.

«Фермерскія гаспадаркі варта разглядаць як патэнцыйных удзельнікаў у вытворчасці агародніны, бульбы, пладоў і ягад. У жывёлагадоўлі свой уклад фермеры могуць унесці ў вырошчванне мясной і малочнай жывёлы, дробных жывёл, пчалярстве», — адзначылі ў прэс-службе міністэрства.

### Пачуць фермера

У такіх умовах важна лепш разумець тое, чаго хочуць людзі, як ім дапамагчы.

Як адзначылі ва ўпраўленні дзяржаўнай уласнасці Мінсельгасхарча, сёння фермеры звяртаюцца да іх па пытаннях аказання фінансавай дапамогі ва ўсталяванні межаў зямельных участкаў і першаснага ўладкавання гаспадаркі: маюць патрэбу ў дапамозе па будаўніцтве дарог, ліній радыё- і электраперадачы, аб'ектаў водазабеспячэння, тэлефоннай сувязі і іншых аб'ектаў, а таксама меліярацыі зямель. Такая падтрымка фермерам аказваецца. У гэтым годзе са сродкаў рэспубліканскага бюджэту на гэтыя мэты ў сукупнасці прадугледжана накіраваць больш за 571 тысячу рублёў.

Нагадаем, што ў мэтах стварэння дадатковых умоў для развіцця фермерскіх гаспадарак **намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл РУСЫ** зацвердзіў комплекс мерапрыемстваў па развіцці і падтрымцы фермерскіх гаспадарак на 2016—2020 гады. У яго ўключаны ў тым ліку продаж, перадача ў арэнду, а таксама перадача ў бязвыплатнае карыстанне фермерскім гаспадаркам аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія выкарыстоўваюцца неэфектыўна.

### Вырашыць прыватныя пытанні

Фермерам таксама дапамагаюць і з больш прыватнымі праблемамі. Напрыклад, не так даўно прадстаўнікоў фермерскіх гаспадарак турбавала пытанне па вядзенні бухгалтарскай справаздачнасці. У законе «Аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці» прапісана, што кіраўнік фермерскай гаспадаркі мае права ўскладаць вядзенне бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці на галоўнага бухгалтара або перадаваць яго вядзенне па дагавары арганізацыі, якая аказвае такія паслугі. Разам з тым, калі фермерская гаспадарка з'яўляецца мікраарганізацыяй, то кіраўнік фермерскай гаспадаркі мае права весці бухгалтарскі ўлік і складаць бухгалтарскую справаздачнасць асабіста, калі адпавядае неабходным патрабаванням.

Большасць кіраўнікоў фермерскіх гаспадарак з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек не адпавядаюць такім умовам і вымушаныя плаціць за гэта іншым арганізацыям, што стварае дадатковую фінансавую нагрузку. Таксама фермерскія гаспадаркі зарэгістраваныя і ажыццяўляюць гаспадарчую дзейнасць пераважна ў сельскай мясцовасці, дзе адчуваецца недахоп кваліфікаваных бухгалтарскіх кадраў.

Таму ў мэтах спрашчэння вядзення бухгалтарскага ўліку ў фермерскіх гаспадарках прыняты Указ Прэзідэнта № 311 «Аб бухгалтарскім уліку ў сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках». Ён дае права фермерскім гаспадаркам пры выкананні пэўных умоў весці бухгалтарскі ўлік у кнізе ўліку даходаў і расходаў сялянскай (фермерскай) гаспадаркі. Гэта павінна вырашыць праблему.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# НЕВЯЛІКІ СЯМЕЙНЫ БІЗНЕС



### Агародніна і ягада

— Цяпер на рынках, у магазінах тавараў хоць заваліся, таму іншае ўявіць няпроста. Але ў калгасныя часы капуста... часта была ў дэфіцыце. І калі мы першы год прывезлі ўраджай у Мінск на кірмаш, чарга выстраілася велізарная, — расказваюць фермеры. — На другі год пасадзілі больш, але не адны мы такія разумныя аказаліся. А яшчэ праз некалькі гадоў некаторыя нашы калегі нават з поля капусту не ўбіралі — так яна ўпала ў цане. У нашай справе ўвесь час бывае пэўная рызыка ў сэнсе збыту. Таму трэба вар'іраваць, сачыць за рынкам...

У самым пачатку амаль усё рабілі рукамі, сям'ёй працавалі ў полі. У наступным годзе з выручаных грошай (яшчэ ў сястры пазычылі дзве тысячы долараў) купілі трактар. Працаваць стала лягчэй.

**Потым гаспадарка стала паступова пашырацца. Узялі яшчэ 30 гектараў, затым 22. Цяпер фермерская гаспадарка «Барушка» мае 55 гектараў зямлі. Па цяперашніх мерках не самая вялікая, але і не самая малая. Зараз на палях вырошчваюцца чорныя парэчкі, буякі, клубніцы, маліны. Агародніна таксама.**

Жывуць фермеры ў Малечы, а палі размешчаны за адзінаццаць кіламетраў, каля вёскі Бухалі. Едзем на поле. Гаспадар паказвае плантацыю клубніц, якія зімавалі пад плёнкай. Ягады пасаджаны па сучаснай тэхналогіі, забяспечаны кропельным палівам. А сухія лісцікі лёгка прыбіраюцца нават звычайнай шчоткай. Маладыя ж хутка пойдуць у рост. Паводле ацэнкі гаспадара-агранома, ягаднік перазімаваў добра, адсюль і спадзяванні на ўраджай.

Буякі зараз актыўна «падсяваюцца» трэскамі. Для іх прыгатавання купілі спецыяльную машыну. Буякам патрэбна менавіта такое асяроддзе. (На трэсках якраз працавалі сын гаспадароў і адзін наёмны работнік.)

Поле з чорнымі парэчкамі радуе вока раўнюткімі радамі кустоў. Летась было амаль 25 гектараў названай ягады, сёлета плануюць пакінуць 16. Патрабуецца замена на маладыя. Дарэчы, год таму фермерская гаспадарка набыла ў Польшчы камбайн для ўборкі парэчак. Агрэгат замяняе працу 80 чалавек. Столькі людзей і знайсці цяжка. А калі і назбіраеш работнікаў у Бярозе, дык іх трэба прывезці, забяспечыць скрынямі, кошыкамі, потым палічыць сабранае, заплаціць. Так што машына хоць і дарагая, але сябе апраўдвае. Да Барушак, дарэчы, ужо нашы машынабудаўнікі прыязджалі. Разбіралі гэтую машыну ледзь не да вінціка, здымалі, капіравалі. Хочуць зрабіць айчынны аналаг.

### У зоне рызыкі

Вырасціць добры ўраджай на глебе з каэфіцыентам у 20 балаў не самае складанае, самае цяжкае — яго прадаць. Асноўную частку тых жа парэчак забірае Расія. Нашы вытворцы бяруць вельмі мала. У Баранавічах было невялікае прадпрыемства, брала ягаду на сок і для кандытарскіх вырабаў, але зараз яно знаходзіцца ў стадыі банкруцтва.

— У Польшчу заедзеш, — разважае Вера Віктараўна, — там столькі розных сокаў, у тым ліку натуральных, з чорных парэчак і на аснове гэтай ягады. У нас не надта шырокі выбар. Сокі ўсё больш з замежных канцэнтратаў. Выходзіць, нікому гэта не трэба.

Гады чатыры таму Аляксандр Барушка на адным з сайтаў у адкрытым доступе знайшоў цікавую для сябе статыстыку мытнага ведамства. Яна датычылася ўвозу ў нашу краіну тавараў менавіта з чорнай парэчкі. І лічбы былі даволі вялікія. Вось вам і імпартазамяшчэнне...

Цікаўлюся, ці бяруць на віно. Аказваецца, бяруць, але за капейкі. Барушкі расказалі цікавы выпадак са сваёй практыкі, калі ягады купіў нарыхтоўшчык аднаго з вінзаводаў. «Адзін раз расійскія партнёры нас падвялі, давяліся аддаць партыю прадукцыі вінаробам. Прыехаў нарыхтоўшчык з бочкамі, куды згрузіў нашу шыкоўную ягаду з латкоў, падрыхтаваных да вывазу. І гэта яшчэ нічога. Потым ён пад'ехаў да воданапорнай вежы... і заліў тыя ягады вадой. Кажа: «Каб болей было — нібыта яны ўжо сок пусцілі». Значыць, там няма ніякага кантролю якасці. Бо ваду ў сучасных лабараторыях выявіць — справа хвілін. Нам, як той казаў, і справы не павінна быць да гэтага, — працягвае гаспадар. — Але, напрыклад, мне, каб пастрыгчыся — а гэта прыкладна шэсць з паловай рублёў, трэба аддаць паўтара вядра чорных парэчак, а ў вялікім горадзе нават два вядры, а то і больш, за 20 мінут работы цырульніка. Таму і шукаем магчымасці збыту ў Расіі, каб не сорамна было прадаваць вырашчанае».

Ці яшчэ вось такі аспект. Больш за дзесяць гадоў Барушкі забяспечвалі ўсе чатыры бальніцы свайго раёна агароднінай. Пастаўлялі ў лячэбныя ўстановы моркву, цыбулю, буракі, капусту прыкладна па 30 з нечым капеек за кілаграм (прыведзены сярэднія цэны на цяперашні час. — **Аўт.**). Потым прамыя пастаўкі забаранілі, сказалі: удзельнічайце ў тэндарах. За ўдзел трэба было плаціць немалую суму, і яны не захацелі. І тэндар выйграў іншы.

**Усё, вядома, зроблена па законе і правілах. Але цяпер бальніцы атрымліваюць агародніну па значна большым кошце, чым магла б прапанаваць гэта фермерская гаспадарка. Тады ў чым сэнс таго тэндара? Усё гэта Вера Віктараўна па-філасофску характарызуе хваробамі росту.**

Агародніну і цяпер яны вырошчваюць у невялікай колькасці, «усяго патроху». Таму што займацца гэтым цікава. Сёлета, напрыклад, вельмі добры попыт на агародніну, яблыкі. Пакуль мы ехалі з Аляксандрам Іванавічам на поле, два разы пазванілі патэнцыйныя пакупнікі. «Але гэта не значыць, што налета будзе тое самае, — разважае фермер. — У нас ніхто не гатовы працаваць па доўгатэрміновых кантрактах, як на Захадзе. Таму мы ўвесь час у зоне рызыкі. І былі ўжо выпадкі, калі нам з калегамі немэтазгодна стала ўбіраць моркву, бо затраты па ўборцы перавышалі кошт закупкі».

### Што далей?

Зараз у Барушкаў ёсць немалы тэхнічны парк, аснову якога складаюць чатыры трактары, два камбайны з рознымі прычапнымі агрэгатамі. Нядаўна купілі грузавую фуру-халадзільнік для перавозкі ягад. У планах абсталяванне невялікага сховішча для сельгаспрадукцыі. Набылі будынак старога млына з участкам. Гэтай вясной пачнецца добраўпарадкаванне тэрыторыі і рэканструкцыя памяшкання. А так вялікага пашырэння яны не плануюць.

— Мы разглядаем сваю гаспадарку як невялікі сямейны бізнес, — расказвае Вера Барушка. — Мы не разлічваем на вялікія даходы, нам не трэба яхтаў ці велізарных віл. Можа, таму маладыя нярэдка расчароўваюцца, пачаўшы падобную справу. А нам трэба, каб была праца, якая забяспечвае годнае існаванне сям'і. Працаваць жа цікава самастойна. Мы былі ў калгасе, ведаем асаблівасці калектыўнай гаспадаркі. А тут ты сам адказваеш за вынік, сам нясеш выдаткі і атрымліваеш дывідэнды. Ну, скажам, не хочаш убіраць моркву, бо сэнсу няма, — твае праблемы. А там прыедуць, умоўна кажучы, тры кантрольныя арганізацыі і кожная выпіша спагнанне...

**І яшчэ. Яна не лічыць магчымым плакацца, што атрымала пенсію ўсяго ў 200 рублёў, бо ў дэкрэтных водпусках была часта. Яна лічыць патрэбным зарабіць на далейшае жыццё, чым і займаецца.**

Зараз Вера Віктараўна і Аляксандр Іванавіч працуюць разам са старэйшым сынам Аляксандрам. Ён хоць і атрымаў спецыяльнасць праграміста, у Мінску не застаўся, прыняў рашэнне прадоўжыць справу бацькоў. Яшчэ двое сыноў, эканаміст і праграміст, працуюць у сталіцы. Дачка Марыя пакуль таксама з бацькамі — яна выкладае у музычнай школе.

— Вось на старасці купім дамок у Бухалях і пераедзем туды, каб быць бліжэй да сваіх палёў, — з загадкавай усмешкай гаворыць, гледзячы на жонку, Аляксандр Іванавіч. — Там усяго адна жыхарка засталася. А то ў дзень больш за 40 кіламетраў накручваем, калі дадому абедаць прыязджаем.

Вера Віктараўна аказалася яўна не гатовай да такога павароту падзей, але мужу пярэчыць не стала: «Трэба падумаць».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Бярозаўскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

# Ілья КОНАНАЎ:

# «МЫ РОБІМ ШОПІНГ БЯСПЛАТНЫМ»




**Вядучы папулярнага шоу на «Беларусь 2» «Капейка ў капейку» Ілья Конанаў з нядаўняга часу з'явіўся і ў ранішнім эфіры — у праграме «Тэлераніца». Увечары ж ён вядзе праграму «Кена». Мы спыталі ў яго, як выйграць у знакамітым спажывецкім шоу, а таксама, дзе знаходзіць крыніцы бадзёрасці раніцай і якім павінен быць карпаратыў, каб у ім пагадзіўся ўдзельнічаць прыстойны вядучы.**

***— Ілья, пра тэлебачанне марыў з дзяцінства?***

— Тое, што я ўяўляў сябе ў тэлевізары, гэта дакладна. Але кім буду — спяваць, весці праграму ці нешта яшчэ, я тады не ведаў. Мне падабалася медыйнасць. Я з дзяцінства гуляў у футбол, і, калі да нас прыязджала прэса, для мяне самае галоўнае было забіць гол ці нейк вызначыцца, каб у мяне ўзялі інтэрв'ю. Трапіць на тэлебачанне атрымалася ў 19, калі я прайшоў кастынг на «БелМузТБ».

***— Футболам сур'ёзна займаўся?***

— Так, з сямі гадоў. Але ў васямнаццаць прыйшлося скончыць з-за траўмы. Пачынаў у футбольным клубе «Мінск», тады каманда называлася «Змена», а заканчваў у БАТЭ, праўда, у дублі. Але ў той час БАТЭ выйшаў у групавы этап Лігі

> **«Нядаўна запрасілі правесці дзявочнік — адмовіўся, бо гэта не маё. Адмаўляюся і тады, калі трэба быць на мерапрыемстве ў касцюме, скажам, папугая ці Чабурашкі».**

чэмпіёнаў, і гэта было вельмі крута.

***— Як трапіў у Белтэлерадыёкампанію?***

— Калі пачаў разумець, што мне цесна на «БелМузТБ». Мне здаецца, абсалютна кожны тэлевядучы марыць трапіць на працу ў Белтэлерадыёкампанію. «Макаёнка, 9» для мяне з дзяцінства было нечым магічным. Памятаю, як мяне вадзілі на дзіцячыя праграмы, дзе я сядзеў сярод гледачоў, а Лора Грыбалёва тады была вядучай. Калі зразумеў, што хачу звязаць свой лёс з тэлебачаннем, першае, пра што падумаў, — што калі-небудзь буду працаваць у Белтэлерадыёкампаніі. Мне параілі: зрабі нешта сваё і прапануй. І вось мы прапанавалі праграму «Капейка ў капейку».

***— Для вядучага, дарэчы, гэта перадача даволі бязлітасная: чаго толькі варта бегчы за ўдзельнікамі, калі яны выбіраюць пакупкі, і задаваць пытанні...***

— Так, трэба захоўваць субардынацыю, каб яны цябе не пабілі *(смяецца)*. Складаны фармат праграмы, але я разумеў, на што іду. Менавіта таму, што праграма народная, яна ўжо чатыры гады ў эфіры, штогод намінуецца ў конкурсе «Тэлевяршыня». І з'яўляецца адной з самых рэйтынгавых. Я вось два дні таму зрабіў пост у сваім «Інстаграме» з фотаздымкам і напісаў, што мы робім шопінг бясплатным за вашу кемлівасць, а вы робіце нашу праграму рэйтынгавай і карысной. І ўжо 341 каментарый. Прыходзяць сотні лістоў ад ахвотных згуляць.

***— Як сярод іх выбіраеце ўдзельнікаў?***

— Па-рознаму. Спачатку, калі здымалі ў ЦУМе, я падыходзіў да людзей і прапаноўваў сыграць. І большасць не пагаджалася: не хацелі, саромеліся, думалі, што гэта нейкі «развод». З дзесяці чалавек сямёра адмаўляліся. А нехта пагаджаўся адразу: я падышоў аднойчы наўздагад да бабулі, ёй, як высветлілася, было 78 гадоў. І яна адразу пагадзілася паўдзельнічаць. І трэба было бачыць, як гэта бабулечка імкнулася выйграць! З-за такіх серый людзі нам паверылі. І калі ёсць такія цікавыя гульцы, мы ідзём на ўступкі: дорым пэўныя рэчы, нават калі яны не прайгралі. Выйграе, дарэчы, прыкладна 4 з 10 чалавек. Ужо зараз, калі праграма ідзе чатыры гады, людзі прыходзяць да нас са спісамі, падпільноўваюць каля ўвахода ў магазін, сацыяльныя сеткі расколваюцца ад лістоў. Я імкнуся ўсім адказваць і тлумачыць, што мы не можам узяць, але стараемся. Да нас прыязджаюць людзі з розных гарадоў, часам выязджаем і самі. Атрымліваем тысячы каментарыяў. І калі ёсць такая аддача, разумееш, што ўсё робіш правільна і праграма павінна жыць.

***— Хто складае пытанні ўдзельнікам?***

— У нас ёсць выдатны сцэнарыст Дар'я Буслава. Мы жартуем, што пытанні Даша піша ў залежнасці ад надвор'я і свайго настрою. Пытанні бываюць і самыя элементарныя: колькі пальцаў на левай руцэ? І нашмат больш складаныя. Але тут ніколі не ўгадаеш. Сам часам не ведаеш адказ, а гулец адказвае. Ці, наадварот, людзі з вышэйшай адукацыяй не могуць назваць сталіцу ЗША, бо ёсць камера і хваляванне.

***— Відавочна, што кур'ёзных момантаў не пазбегнуць.***

— Самы запамінальны выпадак здарыўся, калі праграма запусцілася, але яшчэ не выйшла ў эфір. Мы здымалі дзве пілотныя версіі. Для іх патрэбныя былі цікавыя гульцы. Запрасілі спевака Тэа, які толькі вярнуўся з Еўрабачання, і Ніну Багданаву. Пакуль здымалі, адзін малады чалавек увесь час хацеў сфатаграфавацца. Тэа да таго часу ўжо з'ехаў, а ён хадзіў-хадзіў, потым не вытрымаў і кажа: «У мяне хутка цягнік, можна з вамі сфатаграфавацца?» Ён абдымае мяне і кажа: «Дзякуй вам за «Чыз-кейк». Прыйшлося падыграць: «Гэта наш агульны поспех, дзякуй, што глядзіце».

Вельмі запомнілася гульня з Сашам Саладухам. Ён адразу схапіў чайнік, з якога не знялі магніцік. Я прасіў яго вярнуць на паліцу. Але Аляксандр быў настолькі ў гульні, што пачаў бегаць з гэтым чайнікам, у кожным аддзеле ўсё пачынала пішчаць. Гэта было вельмі весела, хоць і няпроста. У яго выдатная жонка Наталля, якая ўвесь час яго падтрымлівала. І ім не хапіла часу, на балансе засталося 10 капеек. І я кажу: вы прайгралі, усе рэчы застаюцца ў нас. І трэба было бачыць твар Сашы: «Як прайграў, я ж абяцаў Варачцы падарунак?» І мы падарылі ёй гульню, Аляксандр выбраў настольны футбол. Уся праца з Аляксандрам заўсёды заканчваецца шоу.

> **«Я розны вядучы: у «Тэлераніцы» адзін вобраз, у праграме «Пін-код», якую я вёў, другі, у «Кена» — трэці».**

Аднойчы да нас прыйшла жанчына, якая месяц рыхтавалася, трэніравалася ў магазіне. І ў яе было прапісана ўсё: які аддзел, куды бегчы далей, колькі крокаў патраціць да таго ці іншага месца. І яна прайграла. І таксама пасля не разумела як. Таму рэцэптаў, як выйграць, няма. Ёсць я, які адцягвае ўвагу пытаннямі, ёсць людзі, якія часам перашкаджаюць, чэргі. Навакольныя, дарэчы, рэагуюць вельмі станоўча. Нават падтрымліваюць гульцоў: «Колькі ў вас засталося? — 2,34. — Бяжыце сюды, вазьміце крупы...» Я заўсёды марыў пра такое шоу, якое б стала народным. Хтосьці нядаўна напісаў каментарый, што гульня будзе як «Поле цудаў», а Ілья Конанаў праз 20 гадоў стане Леанідам Якубовічам.

***— І як табе такое параўнанне?***

— Мне не даспадобы параўнанні. Я хачу быць Ільёй Конанавым, а не Іванам Ургантам ці Паўлам Воляй. Хоць і не самае горшае параўнанне з «Полем цудаў», і калі праграма пражыве столькі ж, я буду лічыць сваю місію выкананай. Я розны вядучы: у «Тэлераніцы» адзін вобраз, у праграме «Пін-код», якую я вёў, другі, у «Кена» — трэці. Вельмі хацеў весці ранішнюю праграму, будзіць краіну. Бо шоу выхаднога дня ў мяне было, вячэрняя праграма «Кена» таксама, у дзённым эфіры — «Пін-код». А раніцай мяне не было. Таму пайшоў на кастынг, і вось ужо тры тыдні я вядучы «Тэлераніцы».

***— Складана спалучаць некалькі праграм?***

— Як казаў Канфуцый, займіся любімай справай, і ты не будзеш працаваць ніводнага дня. Я не адчуваю напружання, мне ўсё задавальненне ўсе мае праекты. Канешне, пасля дня здымак унутры спустошэнне, ты аддаў сваю энергію, пазітыў. Таму ўвечары я часам крышачку нагадваю робата. Але калі ўдаецца выспацца зноў сем гадзін, раніцай у мяне зноў шмат энергіі і пазітыву. Калі і стамляюся, то ненадоўга: скончыўся эфір, выдыхаеш — і зноў за працу.

***— Ведаю, што любіш падарожнічаць і ездзіш даволі шмат.***

— На што мне не шкада траціць грошы, акрамя падарункаў для маёй бабулі, дык гэта на адпачынак. Там я зараджаюся пазітывам, энергіяй ад сонца і мора. Таму зімой езджу на Гоа, у Тайланд ці Дамінікану — гэта ў прамежку паміж карпаратывамі, бо снежань — наш актыўны сезон. Летам еду кудысьці бліжэй, у Турцыю — на тыдзень, проста змяніць абстаноўку. Перазарадка неабходная, бо інакш, працуючы у такім рытме, хутка згарыш.

***— У правядзенні карпаратываў дапамагае вопыт перадачы «Капейка ў капейку»?***

— Так. Але, як правіла, палова людзей, да якіх ідзеш на мерапрыемства, не маюць уяўлення, дзе я працую. Аднойчы мяне клікалі на карпаратыў, дзе хацелі зрабіць інтэрактыў як на праграме «Капейка ў капейку». На жаль, дата аказалася ў мяне занятай, але мару, што калі-небудзь правяду яго. Не сакрэт, што івэнт-рынак пастаянна мяняецца. Было модна рабіць карпаратывы ў стылі «Вячэрняга Урганта», «Блакітнага агеньчыка», праграмы «Інтуіцыя».

***— Ёсць такія прапановы, ад якіх адмаўляешся?***

— Нядаўна запрасілі правесці дзявочнік — адмовіўся, бо гэта не маё. Адмаўляюся і тады, калі трэба быць на мерапрыемстве ў касцюме, скажам, папугая ці Чабурашкі. Шмат грошай не бывае, але калі адчуваю, што не змагу якасна зрабіць тое, чаго ад мяне чакаюць, за працу не бяруся.

***— Ты казаў, што любіш рабіць прыемныя падарункі сваёй бабулі Святлане Аляксандраўне. Які быў апошні?***

— Бабуля нядаўна ўпала і зламала нагу. Гэта было для мяне самай дрэннай падзеяй за апошнія гады. Я ехаў на мерапрыемства, калі мне патэлефанавалі. Сустрэчу перанёс, хутка паехаў у бальніцу, папрасіў перавесці яе ў іншую палату, зрабіў усё, каб яна адчувала сябе камфортна. Стараўся дапамагчы нечым, каб яна хутчэй паправілася. Зараз ужо ўсё добра. Стараюся яе нечым радаваць. Але для яе самая вялікая радасць — бачыць шчаслівым свайго ўнука. Прычым у любімых праграмах. Бабулі вельмі падабаецца «Капейка ў капейку». Ёй тэлефануюць суседзі і знаёмыя, яна і сама перажывае за гульцоў, нават цiск у яе падымаецца. Гэта мой галоўны крытык і глядач.

> **«Аднойчы да нас прыйшла жанчына, якая месяц рыхтавалася, трэніравалася ў магазіне. І ў яе было прапісана ўсё: які аддзел, куды бегчы далей, колькі крокаў патраціць да таго ці іншага месца. І яна прайграла. Таму рэцэптаў, як выйграць, няма».**

Бабуля любіць пахадзіць на масажы, у СПА, і я часта яе адвожу на працэдуры. Калі бываю за мяжой, прывожу самыя розныя рэчы: ад эксклюзіўных вязаных шкарпэтак да сукенак. Ці падыдуць, не ведаю, але набываю. Я ёй вельмі ганаруся, яна выхоўвала мяне з дзяцінства, я называю яе не бабуляй, а мамай.

***— Знаёмыя цябе характарызуюць як вельмі нераўнадушнага нават да чужых людзей чалавека. Вядомая гісторыя, калі ты не змог праехаць міма мужчыны, якому на вуліцы стала дрэнна...***

— Жанчына выбегла на дарогу і папрасіла спыніцца. Я ўбачыў, што пажылому мужчыну стала дрэнна, але людзі праходзяць міма і з'язджаюць. Спыніўся, хоць паняцця не меў, як аказваць медыцынскую дапамогу. Першая думка: пасадзіць у машыну і адвезці ў бальніцу ці дадому. Так і зрабіў. Жанчына, а гэта была яго жонка, пасля патэлефанавала ў Белтэлерадыёкампанію і дзякавала. Высветлілася, што яна пазнала мяне, бо глядзіць перадачу «Капейка ў капейку». Мне нават няёмка было, што пра гэту гісторыю даведаліся на працы. Нічога асаблівага тут няма, так на маім месцы зрабіў бы кожны.

**Алена КРАВЕЦ.**

РУХ НАПЕРАД

# «РАЙСКАЯ ДАЛІНА» І РАШУЧАЯ ЖАНЧЫНА

## Шыітакі, авечкі і каровы хайлэнд... Якія яшчэ бізнес-ідэі прапануе Тацццяна Чысцякова з Гродзенскага раёна?

**КІРАЎНІКА фермерскай гаспадаркі «Райская даліна» можна назваць акумулятарам розных ідэй. Яе планам і праектам няма канца, хоць і стрэсавых сітуацый хапае. Акрамя ўласнай гаспадаркі, яна вядзе шырокую грамадскую дзейнасць і марыць далучыць жанчын да фермерскага руху.**

### Хто тут пасецца?

Уласную гаспадарку Тацццяна Чысцякова, былая спартсменка-водніца, пачала з разводзення жывёлы, у прыватнасці трусоў. Напачатку зямлі было нямнога, толькі-толькі хапала для іх утрымання. Дарэчы, жывёлы свабодна скакалі па ўчастку, толькі сетку давялося зверху ўладкаваць, каб драпежнікі іх не пацягнулі.

Зямлю пад фермерскую гаспадарку раённыя ўлады выдзелілі разам са старой фермай, якую новыя гаспадары паступова рамантавалі і аднаўлялі. Памяшканне прыстасавалі пад вырошчванне шампіньёнаў і вешанак. Побач, на полі, стварылі ўсё для адпачынку — альтанкі, пляцоўкі для гульняў. Дарэчы, зараз Тацццяна захапілася ідэяй стварэння агратурыстычнага комплексу і шукае аматараў гэтай справы, якія далучыліся б да праекта.

Між тым участак пад Гроднам не адпавядаў задумкам, бо з'явілася ідэя разводзіць авечак. Такі кірунак Чысцякова выбрала невыпадкова — прыклад бачыла ў сваіх родных у Брэсцкай вобласці. Зямельнае пытанне вырашылася без асаблівых праблем. Участак плошчай 14 га быў выдзелены каля аграгарадка Азёры, дзе сапраўды нямала азёраў і наогул маляўнічая зона. Глеба не вельмі ўрадлівая, але ў самы раз пад пашу. Тут і трусам месца знайшлося. Але стаўку фермер робіць усё ж на развіцце авечкагадоўлі. Ёсць пародзісты вытворца, ад якога атрымалі летась прыплод. Пакуль статак невялікі — каля двух дзясяткаў, але ў планах — павялічыць яго да сотні. Тацццяна ўпэўнілася: мясная прадукцыя мае попыт, а вось такія каштоўныя прадукты, як скура і воўна, не запатрабаваныя. Па збыце прадукцыі асноўныя спадзяванні на расійскі рынак.

— Са збытам цяжка, — кажа Чысцякова. — у нас мала хто займаецца перапрацоўкай скуры і воўны, ведаю, што ў Брэсцкай вобласці ёсць вытворчасць па пашыве кожухоў, але ў іх хапае сваіх пастаўшчыкоў, а ў прыватных прадпрыемстваў малыя аб'ёмы. Таму і спадзяёмся на расійскі рынак. Там створаны і развіваюцца пляцоўкі для тавараў беларускіх вытворцаў.

Дарэчы, экспарт фермерскай прадукцыі пакуль не на вышыні, адзначае **генеральны дырэктар абласной асацыяцыі фермераў Уладзімір УШКЕВІЧ.** Акрамя гэтага, сярод асноўных праблем, якія негатыўна ўплываюць на эфектыўнасць работы фермерскіх гаспадарак, — дарагія крэдыты і неразвіты фінансавы рынак, а таксама юрыдычная неабароненасць фермераў. Сутыкнулася з гэтым і Чысцякова.



### Рукі не апусціла

Не ўсе фермеры могуць справіцца з праблемамі. Некаторыя адыходзяць ад гэтай справы. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці ў мінулым годзе спынілі сваю дзейнасць восем фермерскіх гаспадарак. І хоць зарэгістраваны 21 новы фермер, колькасць іх расце марудна. Для таго каб развіццё вёскі ішло хутчэй, мясцовым уладам і асацыяцыі фермераў неабходна працаваць над павелічэннем колькасці фермерскіх гаспадарак, зазначае Уладзімір Ушкевіч.

Не абышлі бокам праблемы і Тацццяну Чысцякову. І з'явіліся яны ў выглядзе... сучаснай магутнай тэхнікі. Так здарылася, што набыла яна ў лізінг беларускі пагрузчык праз сэрвісную арганізацыю. У нагрузку, праўда, вымушана была ўзяць яшчэ і прэс-падборшчык (бо і ён у гаспадарцы не лішні). Вось толькі пагрузчык ледзь не з першага дня пачаў падводзіць. Можна сказаць, працаваў мала, больш прастойваў.

**Замяніць тэхніку вытворцы не згадзіліся, а фермер адмовілася плаціць за няўдалы пагрузчык. Урэшце сэрвісная арганізацыя праз суд пагрузчык забрала, пры гэтым Чысцякову абавязалі вярнуць сродкі за тэрмін карыстання, а гэта ні многа ні мала — 25 тысяч долараў.**

— Да гэтага часу праблем з сэрвісным цэнтрам не было, папярэднія лізінгі «пагашала» датэрмінова, — расказвае Чысцякова. — А вось цяпер вымушана аддаваць за няспраўную тэхніку, на якой нават не паспелі папрацаваць, такія грошы. Вядома, прыйшлося вышукваць фінансы, менш пакідаць на развіццё, прадала і свой аўтамабіль — купіла развалюху 86-га года выпуску...

Але Тацццяна рукі не апусціла і ад фермерства не адмовілася, бо многа ўжо ў гэту справу ўкладзена. Тым больш што трэба асвойваць новы ўчастак у Азёрах. Пакуль зямля там не апрацавана, чаму ёсць важная прычына. Гэты ўчастак фермер Чысцякова плануе сертыфікаваць пад арганічнае земляробства. Пад яго ў хуткім часе будзе падведзена і нарматыўная база. Закон аб арганічным земляробстве можа быць прыняты ўжо сёлета.

— Тут доўгі час зямлю не апрацоўвалі, на ўчастку нават сосны выраслі. Ніякіх хімікатаў не ўносілі, гэта натуральная паша, і нашы жывёлы будуць тут пасвіцца, — кажа Тацццяна Чысцякова. — Як толькі прымуць закон, адразу вазьмуся за афармленне дакументаў.

Натуральная гаспадарка — гэта тое, што фермер узяла за аснову сваёй дзейнасці. У яе ўсё натуральнае. Нават грыбы — вешанкі і шыітакі — яна высейвае на драўніне на вуліцы. Пакуль ураджай невялікі, бо справа новая, але, на думку Тацццяны, перспектыўная. Асабліва калі ўлічваць, што наперадзе яшчэ праект па стварэнні агратурыстычнага комплексу. І ўмовы для гэтага спрыяльныя: побач з фермерскім участкам знаходзіцца ландшафтны заказнік «Азёры» і знакамітае Святое балота. Гэта можа прывабіць турыстаў.



Дарэчы, наяўнасць азёр у гэтай мясцовасці падштурхнула Тацццяну да незвычайнага рашэння — завезці сюды шатландскіх кароў пароды хайлэнд. Каровы маюць доўгую поўсць і доўгія рогі. Гэта паўночная парода, якая не баіцца марозу. А яшчэ, па словах Тацццяны, вельмі добра шатландскія каровы пасуцца каля прыбярэжных участкаў азёр, ачышчаюць ад раслін вадаёмы і наогул маюць вельмі экзатычны выгляд.

### Праблемы — агульныя

Трэба сказаць, што з Тацццянай Чысцяковай, кіраўніком фермерскай гаспадаркі «Райская даліна», мы пазнаёміліся падчас стварэння Цэнтра фермерскіх ініцыятыў. Гэта было некалькі гадоў таму. Затым на базе яе гаспадаркі часта збіраліся жанчыны, каб навучыцца правільна весці фермерскую справу, пераняць вопыт самой Тацццяны, іншых фермераў. Чысцякова лічыць, што жанчыны могуць не толькі быць памочнікамі сваіх мужоў, але і самі здольны кіраваць гаспадаркай. Ініцыятыўныя бізнесвумен маюць усе падставы, каб удала працаваць на зямлі.

— Наш Цэнтр фермерскіх ініцыятыў — гэта грамадская арганізацыя, накіраваная на жанчын, якія хочуць займацца справай, — расказвае Тацццяна Чысцякова. — Трэба дапамагчы ім аб'яднацца. Фермеры, як вядома, народ спецыфічны, яны больш верацьва ўласныя сілы, чым каму-небудзь. А праблемы ў адзіноце не вырашыш. Цябе проста ніхто не пачуе.

**Тое, што фермерства здольна стаць адным з рухавікоў абуджэння вёскі, факт відавочны, лічыць кіраўнік асацыяцыі Уладзімір Ушкевіч. У агульным аб'ёме вытворчасці доля фермерскіх гаспадарак з кожным годам павялічваецца.**

Ды і фермерскі корпус у рэгіёне не такі ўжо малы — 367 гаспадарак, за якімі замацавана 24 тыс. га зямлі. Але развіваецца гэты кірунак вельмі нераўнамерна. Напрыклад, у Гродзенскім раёне 55 фермераў, а ў Астравецкім — толькі 5. У Смаргонскім амаль 30, а ў Ваўкавыскім — усяго 7. Што датычыцца выдзялення зямлі, гэты працэс зараз не такі марудны і складаны, як раней, адзначыў спадар Ушкевіч, хоць многае залежыць ад мясцовых чыноўнікаў. На думку кіраўніка асацыяцыі, варта было б штогод папаўняць фонд пераразмеркавання земляў у кожным сельсавеце.

У Гродзенскім раёне, дзе фермераў многа, а зямлі мала, кожная гаспадарка пільна кантралюецца. Не ўсе вытрымліваюць канкурэнцыю. Некаторыя, што называецца, сыходзяць з дыстанцыі.

— Калі чалавек не апрацоўвае зямлю, запусціў, мы яе забіраем. Вось і зараз падрыхтаваны дакументы аб пазбаўленні зямлі аднаго з такіх фермераў, — адзначае **намеснік старшыні Гродзенскага райвыканкама Генадзь АКСАМІТ.** — Чарга на зямлю існуе. Напрыклад, у гэтым годзе выдзелена фермерам дадаткова 30 гектараў. Хто прыходзіць са сваімі бізнес-ідэямі, планамі, той без праблем можа атрымаць зямлю з калгаснага фонду.

Як аказалася, цікавасць да фермерства ўсё больш праяўляюць жанчыны. І калі ўжо бяруцца за справу, то не кідаюць яе. У фермерскім корпусе маль 30 жанчын, якія ўзначальваюць фермерскія гаспадаркі. А многія з іх умеюць арганізаваць працу не горш за мужчын, а можа, нават і лепш. У мінулым годзе менавіта фермерская гаспадарка пад кіраўніцтвам Наталлі Кулікоўскай з Іўеўскага раёна атрымала званне «Гаспадарка высокай культуры земляробства». А Тацццяна Чысцякова лічыць, што наогул ініцыятыўных жанчын-фермераў варта прыцягваць да грамадскай работы, каб ажывіць фермерскі рух.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ:



**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы Яўген АДАМЕНКА:**

— У нашай краіне ёсць фермеры, якія працуюць не адзін дзясятак гадоў. Некаторыя з іх бралі ўдзел у рэспубліканскім семінары-нарадзе аб развіцці вёскі і павышэнні эфектыўнасці аграрнай галіны Беларусі, які адбыўся 3 красавіка з удзелам Прэзідэнта. Кіраўнік фермерскай гаспадаркі «Новы быт» Шклоўскага раёна Аляксандр Канавалаў выступаў на гэтай нарадзе.

Прыклады паспяховага развіцця фермерства ёсць у кожным рэгіёне. На Гомельшчыне адным з лідараў па аб'ёмах вырошчвання яблыкаў з'яўляецца фермерская гаспадарка «Яблыневы сад», якая размешчана ў Калінкавіцкім раёне. З 2016 года там сталі займацца яшчэ і вытворчасцю морквы, капусты і буракоў. Гаспадарка штогод вырабляе 800—900 тон яблыкаў, мае пладасховішча, набыла вытворчы камбінат, у якім мадэрнізавала перапрацоўчыя цэхі.

Каля 2 тысяч гектараў сельгасугоддзяў мае знакамітая сялянская гаспадарка Міхаіла Шрубы ў Тураве. Там займаюцца і жывёлагадоўляй — вырабляюць штогод больш за 1000 тон свініны, маюць статак з 3000 галоў буйной рагатай жывёлы.

У Мінскай вобласці ёсць добры прыклад фермерскай гаспадаркі, якая спецыялізуецца на козагадоўлі — гэта «ДАК» у Дзяржынскім раёне. Вырабляючы сыры і ёгурт з казінага малака, яны не толькі забяспечваюць сталіцу, але і пастаўляюць сваю прадукцыю на экспарт.

Дзяржава стварае аднолькавыя ўмовы і для буйных сельгаспрадпрыемстваў, і для фермераў. Аднак у адрозненне ад краін-суседак мы пасля распаду Савецкага Саюза буйную таварную вытворчасць не развалілі. Таму асноўную долю ў валавой дабаўленай вартасці займаюць менавіта буйныя гаспадаркі, сельгаскааператывы, агрaхолдынгі. Гэта абумоўлівае і выкарыстанне шыроказахопнай тэхнікі на палях, іншыя аспекты працы і жыцця людзей у вёсцы. Сельскагаспадарчая арганізацыя дапамагае насельніцтву апрацоўваць прысядзібныя ўчасткі, падтрымлівае інфраструктуру на вёсцы. Так склалася.

Праблемы ёсць. Іх характар залежыць ад віду прадукцыі, якую вырабляе фермерская гаспадарка, ад яе месцазнаходжання. Ёсць пытанні па выкарыстанні маёмасці, іншыя.

Закон «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы» быў прыняты на пачатку 1991 года, апошнія змены ў яго ўносіліся амаль 11 гадоў таму. За гэты час шмат чаго змянілася: сусветныя тэндэнцыі, спецыфіка ў галіне. Жыццё ўвесь час ставіць перад намі новыя пытанні. Зараз актуальнай становіцца арганічная вытворчасць. Мы ўжо разгледзелі адпаведны законапраект у першым чытанні і сёлета павінны прыняць яго ў другім чытанні. Гэты закон створыць перспектыву і для фермераў.

Надышоў час больш дэталёва вывучыць сферу дзейнасці фермерскіх гаспадарак і, калі ёсць патрэба, унесці новыя змены ў заканадаўства.

# КРЫНІЦА Ў ГОНАР СВЯТОГА І МОСЦІК — ТАЛАКОЙ

## Аб чым турбуюцца старасты дзвюх невялікіх вёсак

**У Расненскі сельсавет Камянецкага раёна ўваходзіць 15 населеных пунктаў, дзе абрана дзевяць старастаў. Гэтай вясной зноў пройдуць сходы па іх выбарах. Старшыня Расненскага сельскага Савета дэпутатаў Валерый БЯДУЛЯ сказаў, што ўсе старасты ў іх на сваім месцы, маюць аўтарытэт у вяскоўцаў. Марыя Кмец і Ганна Белавец займаюцца грамадскай работай у вёсках, якія зараз прынята называць неперспектыўнымі, бо і ў адной, і ў другой засталося каля чатырох дзясяткаў жыхароў.**

### ТУМІН

Марыя Мікалаеўна Кмец старастай у Туміне ўжо даўно. На сходах яе каторы раз аднадушна выбіраюць на гэтую грамадскую пасаду. Бо хто ж яшчэ? Сама яна родам з суседняй вёскі, сюды замуж выйшла. А лідарства, відаць, дасталася ў «спадчыну» ад свёкра. Менавіта Марцін Максімавіч Кмец быў доўгі час самым аўтарытэтным чалавекам у вёсцы. Таму зразумела, што некалі яго абралі першым старшынёй калгаса. Было гэта адразу пасля вайны, калі калгасы толькі ўтваралі і кожная вёска складала асобны калгас. Вось яму і даверылі кіраваць калектыўнай гаспадаркай.

Потым калгасы ўзбуйнілі, Тумін далучылі да іншага. А да Марціна Кмеца людзі па-ранейшаму ішлі параіцца. І ўжо будучы зусім пажылым пенсіянерам, ён выходзіў на лавачку пад ліпу з газетай і праводзіў «палітінфармацыю», сваімі словамі пераказваў і даваў інтэрпрэтацыю падзеям у краіне і свеце. А тая Марцінава ліпа да гэтай пары стаіць. І хоць пасадзіў яе свёкар у 1905 годзе, Марыя Мікалаеўна лічыць, што дрэва яшчэ здаровае, яго чапаць не трэба. А да меркавання старасты тут усе прыслухоўваюцца, старшыня сельскага Савета таксама. Марыя Кмец не проста староста, яна захавальніца галоўнай славутасці вёскі — яе крынічкі. «Паглядзіце, якая наша вадзіца, нібы крышталь, на чайніку і за месяц ніякага накіпу не ўтвараецца».

Спецыялісты праводзілі тут даследаванне і адзначылі, што крыніца ў Туміне размешчана на глыбокай гліне, якая лічыцца вельмі добрым адсарбентам — яна паглынае пахі, таксіны, мікробы, газы, нават абясшкоджвае яды. А вада на гліне, як і сама гліна, танізуе арганізм, заспакойвае нервы. Здаўна Тумін вызначаўся вялікай колькасцю доўгажыхароў. Людзі лічылі, што гэта звязана з вадой, якую яны п'юць. Вось і Марцін Кмец, які пражыў 92 гады, успамінаў, што ў яго дзяцінстве людзі пілі ваду менавіта з яе. Не так даўно ўнучка Марыі Мікалаеўны вазіла ваду ў Мінск і навукоўцы далі ўзору найлепшую характарыстыку.



Старшыня сельскага Савета Валерый БЯДУЛЯ і староста Ганна БЕЛАВЕЦ.



Марыя КМЕЦ.

Крынічку любілі і шанавалі ў вёсцы. Але ў канцы 90-х, калі пра гаючыя ўласцівасці крыніц сталі гаварыць і пісаць, у Тумін паехалі людзі. Вакол крыніцы паявілася смецце, пад'езд стаў разбівацца, тэрыторыя прыйшла ў заняпад. Жыхары пабойваліся, што крыніца наогул можа схавацца ў зямлі. Так часам бывае.

— Аднойчы прыехала да нас тагачасны старшыня раённага Савета Ніна Стасюк, — расказвае Марыя Мікалаеўна. — Мы і папрасілі яе паспрыяць. Ніна Данілаўна ўзняла пытанне ў раёне. Падключыўся калгас — тады яшчэ «Савецкая Беларусь», знайшліся і будаўнічыя матэрыялы, і рабочыя. Правялі добраўпарадкаванне, паставілі калодзежныя кольцы, вакол зацэментавалі. Побач абсталявалі купель. Вось і сёлета на Вадохрышча столькі ахвотных прыехала акунуцца менавіта ў нас. Кожны дзень і з Брэста, і з іншых гарадоў едуць па ваду. Нядаўна з Польшчы госці былі, усім наша вадзіца падабаецца.

Крыніцу — пасля таго, як добраўпарадкавалі — асвяцілі ў гонар святога Панцеляймона. Кожны год 9 жніўня тут праводзяцца набажэнствы. А парадак вакол падтрымлівае староста з дапамогай вясковых жанчын.

— Вой, вы прыехалі, а ў нас не вельмі прыгожа, мы якраз усе ручнікі паздымалі, каб памыць-папрасаваць перад Вялікаднем, — расказвае староста. — На жаль, не ўсе, хто па ваду прыязджае, паводзяць сябе належным чынам. Так што даводзіцца смецце прыбіраць, посуд мяняць. А некаторыя ўзялі за моду катоў хатніх тут пакідаць. Прыедуць нібы вады набраць, а потым, гляджу, кацяня жаласліва мяўкае. Бяру сабе. Вось зараз у мяне на падворку тры каты. Было, і сабачку пакінулі. Потым мы яго прыстроілі... Пакуль расказвае, Марыя Мікалаеўна паспявае стрэсці прыгнаныя ветрам лісткі з пакрывала, якім яна раней захінула купель.

Вядома, у старасты ёсць і іншыя клопаты. Але ўсе суботнікі, кампаніі па добраўпарадкаванні так ці інакш звязаны з крыніцай. З яе цяпер пачынаецца вёска.

### МЫКШЫЦЫ

У Мыкшыцах зараз зарэгістравана 43 чалавекі. Калі мы прыехалі, староста Ганна Белавец актыўна прыбірала дом. Ганна Фёдараўна любіць, каб было чыста і ва ўласнай хаце, і ў вёсцы. Старастай яе абіралі ўжо два разы, такім чынам атрымалася восем гадоў. Асноўным клопатам сталі мосцікі. Мыкшыцы з Расной раздзяляе рака Пульва. Тут спакон вякоў людзі пракладвалі праз рэчку пешаходныя мосцікі. Бо гэта значыць «у Расну схадзіць за паўкіламетра», а калі ў абыход — будзе ўсе пяць. Адзін з мастоў, самы трывалы, і прыйшоў у заняпад з часам. Ганна Фёдараўна ўзняла на ногі ўсю грамаду. Сельскі Савет звярнуўся да сельгаспрадпрыемства. Прывезлі дошкі, іншыя будматэрыялы, мост умацавалі. А ўжо даводзілі яго да ладу мясцовыя актывісты, як заўважыў старшыня сельскага Савета, метадам народнай будоўлі.

Такім жа чынам прывялі ў парадак яшчэ два масткі. Вёска Мыкшыцы цягнецца ўздоўж адной вуліцы. Нездарма ж продкі зрабілі пераходы ў трох розных месцах для зручнасці.

Здавалася б, што той мост. А калі мы падышлі да яго, то сустрэлі ўнука Ганны Фёдараўны. Сямікласнік вяртаўся са школы. Вядома, ён мог бы пад'ехаць школьным аўтобусам. Але аўтобус развозіць дзяцей пасля шасці вечара, бо дадому едуць і выхаванцы дзіцячага садка. А так хлопец выйграе дзве гадзіны. Дома ён дапамагае па гаспадарцы, пахвалілася бабуля, і ўжо многае ўмее.

Аўтакрама ў вёску прыходзіць, але ж не ва ўсе дні. А праз масток можна схадзіць у магазін калі хочаш: «Вунь суседка ўжо хлеб нясе».

«Як толькі не заклікала, не прасіла, калі трэба было выйсці падрамантаваць масток! Аднаму кажу, каб прыйшоў, а ён: «А бутэльку ты паставіш у канцы мастка?» Кажу: «Хіба ты не будзеш хадзіць цераз мост?» Усяляк угавbooрваю, ушчуваю. Галоўнае, каб вынік быў», — усміхаецца Ганна Фёдараўна. На тое ж яна і староста.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Камянецкі раён.

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**об открытом аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Кобрине Брестской области 10 мая 2018 года в 11.00**

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Кобрин, ул. Настасича | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007857 | 0,0034 | Сети газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения и канализации проходят по улице | 2000 | 200 | 2051,72* |
| 2 | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 9) | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007850 | 0,0030 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 5000 | 500 | 1765,65* |
| 3 | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 10) | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007851 | 0,0030 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 5000 | 500 | 1765,65* |
| 4 | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 11) | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007852 | 0,0030 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 5000 | 500 | 1765,65* |
| 5 | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 12) | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007853 | 0,0030 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 5000 | 500 | 1765,65* |
| 6 | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 13) | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007854 | 0,0030 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 5000 | 500 | 1765,65* |
| 7 | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 14) | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007855 | 0,0030 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 5000 | 500 | 1765,65* |
| 8 | г. Кобрин, ул. Интернациональная (район торгового павильона «Гурман») | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007858 | 0,0115 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 4000 | 400 | 1824,26* |
| 9 | г. Кобрин, ул. Дружбы (район дома № 21) | Строительство и обслуживание здания магазина-кулинарии (для размещения объектов розничной торговли) | 20 лет | 124350100001007856 | 0,1021 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 20500 | 2050 | 2670,15* |

** расходы на публикацию извещения в СМИ*

**Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет**

**Аукцион состоится 10 мая 2018 года в 11.00** по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**
**Последний день приема заявлений – 4 мая 2018 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**
Продажа права заключения договора аренды земельного участка осуществляется индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам.
К участию в аукционе допускаются индивидуальные предприниматели, юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region.gov.by

НОВЫ ПАДЫХОД

# «ЗЯЛЁНЫ» ГОРАД НАВАГРУДАК



**ПРА пачатак рэалізацыі ў краіне сумеснага міжнароднага праекта «Зялёныя гарады» ў Навагрудку, а таксама ў Полацку і Наваполацку, «МС» ужо расказвала. Нагадаем, праект мае на мэце фінансавае садзейнічанне (агульны бюджэт $3 091 000) укараненню прынцыпаў «зялёнай» эканомікі ў малых і сярэдніх гарадах краіны.**

Вулічнае асвятленне і спажыванне энергарэсурсаў у жылым сектары Навагрудскага раёна — вось два галоўныя кірункі сумеснай работы мясцовай улады і яе партнёраў — прадстаўнікоў праекта Праграмы развіцця ААН. Намаганні сканцэнтраваліся на павышэнні энергаэфектыўнасці жыллёва-камунальнай гаспадаркі. А тут ёсць над чым працаваць. Па словах **кансультанта праекта па пытаннях энергетычнай эфектыўнасці Івана ФІЛЮЦІЧА,** штогод у Беларусі толькі ў сістэме ЖКГ выдаткоўваецца звыш 1,5 мільярда рублёў на набыццё паліва, абсталявання і г. д. Каласальныя сродкі, супастаўныя з выдаткамі на ахову здароўя, адукацыю. Зразумела, што раёны нясуць велізарную нагрузку. Толькі ў Навагрудку летась з мясцовага бюджэту (а гэта каля 55 мільёнаў рублёў) прыкладна 5,5 мільёна рублёў было накіравана на фінансаванне энергетыкі ЖКГ.

На чым можна істотна сэканоміць? Напрыклад, на тым жа вулічным асвятленні. Навагрудак, па словах эксперта, адзін з тых невялікіх і нешматлікіх гарадоў, дзе ўмеюць ужо эканоміць. Але зроблены толькі першыя крокі. З дапамогай сродкаў праекта можна ўкараніць сучасныя сістэмы кіравання асвятленнем вуліц на базе святлодыёдных свяцільняў. Таксама мяркуецца набыць сучасныя сістэмы ўліку спажывання энергарэсурсаў — гэта дазволіць знізіць іх затраты, у прыватнасці ў жыллёвым фондзе. У недалёкай будучыні ёсць намер ажыццявіць у Навагрудку мадэль энергаэфектыўнага квартала.

Дарэчы, рэалізацыю названага праекта актыўна падтрымліваюць Глабальны экалагічны фонд (ён выступае ў ролі фінансавага донара) і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі. І не толькі таму, што праект накіраваны на паляпшэнне экалагічнай сітуацыі ў раёне. Навагрудак — прыклад таго, як мясцовая ўлада імкнецца выкарыстоўваць усе магчымыя крыніцы набліжэння да «зялёнай» эканомікі. І яшчэ гэта адзіны ў краіне раён, які аддае электраэнергіі з аднаўляльных крыніц больш, чым сам спажывае. Гэтаму ў пэўнай ступені садзейнічалі і прыродна-кліматычныя ўмовы раёна. Яго большую частку займае Навагрудскае ўзвышша, таму невыпадкова ў раёне працуе самы вялікі ветрапарк краіны: аж 14 ветракоў, станцыя сонечных батарэй. Ужо некалькі гадоў запар у раёне праводзяцца тыдні энергаэфектыўнасці.

Як і ў кожнай вялікай справе, падчас работы над гэтым праектам узнік шэраг пытанняў, ад вырашэння якіх у значнай ступені будзе залежаць агульны поспех. У прыватнасці, неаднойчы гаварылася пра важнасць пашырэння тлумачальнай работы сярод насельніцтва раёна. Людзей неабходна вучыць «энергаэфектыўнасці», эканоміі на паслугах ЖКГ. **Алена СЯЛЕВІЧ, першы намеснік старшыні Навагрудскага райвыканкама,** расказвае:

— Мы ўдзячныя дэпутатам раённага Савета, якія актыўна падтрымліваюць ідэю «зялёнай» эканомікі, прапагандуюць яе падыходы і прынцыпы, пераконваюць у перавагах энергаэфектыўнасці. Ужо сфарміравалася група старшынь сельскіх Саветаў, якія працуюць з насельніцтвам, расказваюць пра спосабы энергазберажэння. У даступнай форме тлумачаць аднавяскоўцам, што гэта за паняцце такое, імкнуцца паказаць, якім можа быць іх асабісты ўклад у «азеляненне» эканомікі краіны. Па магчымасці садзейнічаюць рэалізацыі энергазберагальных праектаў.

Алена Леанідаўна прыводзіць у прыклад пасёлак Любча, дзе жыве каля тысячы чалавек. Там правялі замену 150 старых электралямпаў вулічнага асвятлення на больш эканамічныя, святлодыёдныя. Гэта, з аднаго боку, палепшыла жыццё мясцовых жыхароў, а з другога, прынесла значную эканомію бюджэтных сродкаў. А ініцыятарам і рухавіком гэтай актуальнай мадэрнізацыі стаў старшыня Любчанскага пасялковага Савета дэпутатаў Іван Ярмоц.

Прадстаўнікі мясцовай улады, з якімі мы размаўлялі, небеспадстаўна лічаць, што вучыць «зялёнай» эканоміцы, ашчаднасці, энергазберажэнню трэба з дзяцінства. Літаральна з дзіцячых садкоў. Іх выхаванцы, як нам з гумарам казалі мясцовыя жыхары, ужо падказваюць бацькам, у якую скрыню для збору другаснай сыравіны трэба кідаць паперу, шкло ці пластык. Вось ён, вынік выхаваўчай работы, калі «яйкі» вучаць «курыцу» экалогіі.

Дарэчы, скрыні для бытавых цвёрдых адходаў у Навагрудку сапраўды прывабныя і не зусім звычайныя, такіх у Мінску я яшчэ не бачыў. Яны былі пастаўлены гораду ў рамках рэалізацыі іншага міжнароднага праекта. Гэтыя ёмістасці для адходаў носяць і пэўны адукацыйны характар. На кожнай можна прачытаць парады. На скрынках пазначаны рэкамендацыі-ўдакладненні. Скажам, на скрыні для паперы: часопісы, газеты, сшыткі, офісныя паперы, рэкламныя праспекты. На скрыні для шкла: бутэлькі з-пад напояў, посуд, ліставое шкло. Але ёсць і папярэджанне: не кідаць туды фарфор, кераміку, арміраванае шкло. Такія рэкамендацыі-надпісы ёсць на ўсіх скрынях: што кідаць, а што не трэба. Проста і даходліва. Думаецца, досвед варты пераймання.

Летась у Навагрудку прайшоў фестываль «Зялёная эканоміка як беларускі культурны код». Назва на першы погляд здаецца пафаснай. Але калі меркаваць па праграме фестывалю, гэты пафас апраўданы. Падлеткі ўдзельнічалі ў «мабільнай» і «энергаэфектыўнай» віктарынах, пры дапамозе «анлайн-калькулятараў» вучыліся эканоміць на камуналцы, знаёміліся з работай сонечных батарэй і г. д.

Але мала пабудаваць «зялёны» горад, трэба і яго, і навакольнае асяроддзе пастаянна ўтрымліваць у належным стане. У Навагрудку і гэту праблему ўзяліся вырашаць самастойна. У мясцовым аграрным каледжы з 2018 года адкрываецца новая спецыяльнасць — «Ахова навакольнага асяроддзя і рацыяльнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў». Рыхтаваць будуць эколагаў. База для гэтага ёсць. У каледжы створаны навучальны і кансультацыйны цэнтр, у якім моладзь і дарослыя жыхары Навагрудка знаёмяцца з асновамі «зялёнай» эканомікі, выкарыстаннем энергіі сонца, ветра, той жа энергаэфектыўнасцю.

Зразумела, пераход да «зялёнай» эканомікі — шматгранная праца на перспектыву, якая зойме не адзін год. І на гэтым шляху давядзецца шмат чаго змяніць: у краіне — законы, у раёнах паўсюдна, дзе гэта мэтазгодна, — укараніць рэсурсазберагальныя тэхналогіі, шырока задзейнічаць крыніцы альтэрнатыўнай энергіі, навучыць гараджан, жыхароў пасёлкаў і вёсак быць, так бы мовіць, больш экалагічнымі, больш «зялёнымі». А пачынаць лепш з малога: укараненне энергаэфектыўнасці ў нашу гаспадарчую дзейнасць і побыт, істотнага скарачэння выкідаў аўтамабільных газаў, іншых мер паляпшэння камфорту гарадскога асяроддзя.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**


**ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЗА 2017 год**

Организация: **Открытое акционерное общество «Чернавчицкий завод железобетонных изделий»**
Учетный номер налогоплательщика: **200034706**
Вид экономической деятельности: **производство сборных железобетонных и бетонных конструкций и изделий**
Орган управления: **без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **тыс. руб.**
Адрес: **225030, ул. Трудовая, 1Г, д. Чернавчицы, Брестский район, Брестская область**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| **I.ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 532 | 553 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **532** | **553** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 268 | 259 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 5 | 5 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 161 | 72 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 19 | 27 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **453** | **363** |
| **БАЛАНС** | **300** | **985** | **916** |
| **Собственный капитал и обязательства** | | | |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 608 | 608 |
| Резервный капитал | 440 | **22** | 22 |
| Добавочный капитал | 450 | 171 | 120 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 63 | 77 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **864** | **827** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 121 | 89 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **121** | **89** |
| **БАЛАНС** | **700** | **985** | **916** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 1 350 | 1 146 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (1 150) | (984) |
| Валовая прибыль | 030 | 200 | 162 |
| Управленческие расходы | 040 | (182) | (174) |
| Расходы на реализацию | 050 | (18) | (17) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | - | (29) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 20 | 31 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (39) | (37) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (19) | (35) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 13 | 15 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (5) | (4) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 8 | 11 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (11) | (24) |
| Налог на прибыль | 160 | (3) | (1) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (14) | (25) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 51 | 44 |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 37 | 19 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | (0,000829) | (0,001481) |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | (0,000829) | (0,001481) |
| **Данные отчетности подтверждены:** | **ИП Климович М. М., свидетельство № 0265315 от 02.03.2011 г.** | | |

**Информация об ОАО**

| | |
|---|---|
| **4.** Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) | 0 |

**5–6. Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Ед. изм. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 114 | 114 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 0 | 0 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 114 | 114 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 0 | 0 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 0 | 0 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | руб. | 0 | 0 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | руб. | 0 | 0 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | руб. | 51,2 | 49,0 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | 0 | 0 |
| **8. Среднесписочная численность работающих** | человек | 67 | 72 |
| **9.** Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг | Производство сборных железобетонных и бетонных конструкций и изделий – 97,9 % | | |

**10.** Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **23 марта 2018 г.**
**13.** Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения:
Регламент работы ОАО с реестром владельцев ценных бумаг – утвержден общим собранием акционеров (протокол № 15 от 24.03.2010). Положение об аффилированных лицах – утверждено наблюдательным советом общества (протокол №104 от 02.03.2011).
**14.** Адрес официального сайта ОАО в глобальной компьютерной сети интернет: www.cpzjbi.brest.by

Директор ОАО С. В. Мороз

Главный бухгалтер Д. Ф. Мануйлович



Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает, что **24 апреля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1** состоится **повторный аукцион** по продаже земельного участка **У-307 микрорайон «Барановичи-5, 6»** для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома с кадастровым номером **440100000003004967** площадью **0,0982 га**.

Начальная цена продажи: **15 535,26 рубля,** сумма задатка – **2 300 рублей.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **по 18 апреля 2018 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 742095.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

УНП 590727594

БУДЗЬ У КУРСЕ!

## У Правілах палявання — змяненні

**21 сакавіка Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ № 112 «Аб паляванні і вядзенні паляўнічай гаспадаркі», які афіцыйна апублікаваны 24 сакавіка на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь (pravo.by). У адпаведнасці з указам, з 25 сакавіка ўступілі ў сілу змяненні і дапаўненні ў Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання (Правілы палявання). Пра іх расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**



Пералік паляўнічых жывёл дапаўняецца двума новымі відамі птушак — гогаль і качка-свіязь. Іх здабыча дазваляецца ў веснавым (толькі качароў) і летне-восеньскім сезонах палявання.

Таксама ў адпаведнасці са змяненнямі, агульная працягласць веснавога сезона палявання на гусей і качак не можа перавышаць 28 дзён, дазволеных для правядзення ружэйнага палявання на паляўнічых жывёл гэтых ненармаваных відаў, за выключэннем палявання па паляўнічых турах. Такім чынам, у вызначаным карыстальнікам паляўнічых угоддзяў перыядзе палявання на гусей і качароў у веснавым сезоне палявання агульная колькасць фактычна дазволеных для гэтага палявання дзён не можа перавышаць 28. У той жа час паляванне па паляўнічых турах можа праводзіцца на працягу ўсяго тэрміну палявання.

Прадугледжаная ўказам новая рэдакцыя Правілаў палявання ўступае ў сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання — з 24 верасня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ІДЭАЛЬНАЯ ПАРКОЎКА ДЛЯ РОВАРА

## Якой яна павінна быць і ці ёсць такія ў нашых населеных пунктах?

**Хоць зіма сёлета была доўгай, але вясна, а з ёю і адкрыццё новага веласіпеднага сезона, усё роўна на падыходзе. На гарадскіх вуліцах хутка з'явяцца тысячы ровараў. Сёння ўвогуле модна быць спартыўным, мець якасную «машыну» і рэгулярна карыстацца ёй. Нездарма ў сталіцы шырока разгортвае сваю дзейнасць Мінскае роварнае таварыства, а яго эксперт Максім ПУЧЫНСКІ з аптымізмам расказвае пра велаактывістаў.**

— Мінскае роварнае таварыства (МРТ) было створана ў 2011 годзе групай актывістаў, неабыякавых да будучыні веласіпеднага руху ў сваім горадзе і Беларусі ў цэлым. Мэта таварыства — зрабіць Мінск горадам, зручным для веласіпедыстаў, пешаходаў і іншых удзельнікаў дарожнага руху. Для гэтага арганізацыя працуе над развіццём веласіпеднай інфраструктуры, займаецца папулярызацыяй веласіпеднага руху і «велакультуры», развівае веласіпедны турызм.

За сем гадоў дзейнасці Мінскае роварнае таварыства стала экспертнай арганізацыяй, да якой прыслухоўваюцца мясцовыя, рэспубліканскія ўлады, ДАІ ды грамадскія арганізацыі. Наша каманда ўдзельнічала ў распрацоўцы Нацыянальнай канцэпцыі развіцця веласіпеднага руху. Таксама мы арганізуем веласіпедныя мерапрыемствы, займаемся развіццём гарадской велакультуры, абараняем інтарэсы веласіпедыстаў.



***— Чаму так важна развіваць веласіпедны рух у Беларусі?***

— Прычын некалькі. Самае галоўнае, што ровар — гэта добры спосаб падтрымліваць здароўе. Цяпер у многіх людзей сядзячы лад жыцця і недахоп фізічнай актыўнасці. Пры гэтым большасць гараджан працуюць прыкладна за чатыры-сем кіламетраў ад дому і ездзяць на працу на грамадскім транспарце або машыне. На ровары ў спакойным тэмпе гэтую адлегласць можна пераадолець за 30 хвілін. Такія штодзённыя велапрагулкі на працу паляпшаюць работу сэрца і дыхальнай сістэмы, павышаюць прадукцыйнасць мозга, паляпшаюць памяць і ўмацоўваюць мышцы.

Яшчэ адна прычына ў тым, што ровар — аптымальнае рашэнне транспартных праблем. Гэта ідэальны сродак перамяшчэння на кароткія адлегласці. Чым больш людзей перасаджваецца на веласіпеды, тым менш затораў і аварый, тым менш загружаны горад аўтамабільнымі паркоўкамі. Ад гэтага выйграюць усе — аўтааматары, пешаходы, веласіпедысты і людзі, якія карыстаюцца грамадскім транспартам.

> Барацьба з няправільнымі паркоўкамі і прасоўванне зручнай веласіпеднай інфраструктуры сёння назіраюцца ў многіх гарадах Беларусі — Гомелі, Брэсце, Полацку, Оршы.

Таксама ровар вырашае экалагічныя праблемы ў горадзе. Колькасць шкодных выкідаў можна знізіць дзякуючы якраз гэтаму віду транспарту.

Акрамя таго, ровар спрыяе эканамічнаму развіццю дзяржаў. Сродкі, укладзеныя ў веласіпедную інфраструктуру, кампенсуюцца за кошт эканоміі на развіцці аўтамабільнай інфраструктуры, зніжэння колькасці аварый і смерцяў на дарогах.

***— Растлумачце, як павінны выглядаць сучасныя велапаркоўкі?***

— Адна з пераваг ровара — магчымасць паездак «ад дзвярэй да дзвярэй». Таму велапаркоўкі каля крам, вакзалаў, банкаў, пошты, культурных цэнтраў ствараюць камфорт для выкарыстання ровараў. Пры гэтым веласіпедысты павінны быць упэўнены, што знойдуць свой транспарт непашкоджаным там, дзе яго пакінулі. А ў ідэальным выпадку — пры выкарыстанні крытай велапаркоўкі — ровар будзе яшчэ і сухім.



Сёння ў Беларусі ўстаноўлены самыя разнастайныя велапаркоўкі, але большасць з іх практычна непрыдатная для зручнага і бяспечнага захоўвання ровараў. Добрая велапаркоўка павінна дазваляць прымацоўваць раму і адно або абодва колы, не допускаць падзення ровара, нават калі яго зачэпяць, засцерагаць колы ад выварочвання і выгінання, падыходзіць для розных тыпаў ровараў.

Самы аптымальны варыянт для велапаркоўкі — канструкцыя ў выглядзе літары П. Яна адпавядае ўсім вышэйапісаным патрабаванням, лёгка манціруецца і ўпісваецца ў інтэр'ер вуліц. На адной стойцы можна зафіксаваць два ровары, а форма стойкі дазваляе заблакаваць іх замкамі ў двух месцах.

Велапаркоўкі з мацаваннем аднаго кола неэфектыўныя, незручныя ў выкарыстанні і небяспечныя, бо павялічваюць магчымасць крадзяжу.

***— Дзе плануецца ўстанавіць велапаркоўкі ў Мінску?***

— Сёлета паркоўкі павінны з'явіцца каля станцый метро «Няміга» і «Барысаўскі тракт». Згодна з мінскім стратэгічным планам развіцця веласіпеднага руху да 2020 года ў кожным раёне з'явіцца не менш за сем новых велагаражоў. 100 % навучальных карпусоў і не менш чым 50 % інтэрнатаў павінны быць забяспечаны дастатковай колькасцю велапарковак.

У канцы 2017 года наша таварыства разаслала ў гандлёвыя сеткі, банкі і на пошту лісты з рэкамендацыямі аб тым, якія велапаркоўкі больш зручныя. Кампаніі, якія адказваюць на нашы лісты, як правіла, абяцаюць усталяваць іх па меншай меры каля новых аддзяленняў і будынкаў гандлёвых сетак. Некаторыя атрымальнікі лістоў практычна адразу патэлефанавалі, каб даведацца, колькі будзе каштаваць правільная веласіпедная паркоўка і дзе яе можна набыць.

***— Ці ёсць падобныя ініцыятывы ў іншых гарадах Беларусі і як яны рэалізуюцца?***

— Папулярная сваімі кампаніямі гродзенская абласная арганізацыя «ВелаГродна». Яшчэ ў 2012 годзе мясцовыя актывісты распачалі акцыю «Забяспеч сабе паркоўку!» У той час у горадзе было ўсяго 12 велапарковак. Аднак сваімі лістамі, акцыямі, зваротамі велаактывісты дамагліся таго, што ўласнікі будынкаў памянялі стаўленне да веласіпеднай інфраструктуры і зараз у горадзе каля 300 велапарковак.

У цэлым жа барацьба з няправільнымі паркоўкамі і прасоўванне зручнай веласіпеднай інфраструктуры сёння назіраюцца ў многіх гарадах Беларусі — Гомелі, Брэсце, Полацку, Оршы. Цікавую ініцыятыву зараз маем у Салігорску. Там велапаркоўкі для горада вырабляюць навучэнцы мясцовага тэхналагічнага каледжа на практычных занятках.

У цэлым жа аб інфраструктуры ў кожным канкрэтным горадзе можна пачытаць на сайце rovar.info.

Увогуле, у рамках праекта «Гарадскі веларух у Беларусі» пры падтрымцы Еўрасаюза Мінскае роварнае таварыства і «ВелаГродна» праводзілі даследаванне гасцініц і хостэлаў на «веладружалюбнасць», гэта значыць высвятлялі, дзе зручней за ўсё спыніцца велатурыстам. Цяпер у нас ёсць спісы веладружалюбных гасцініц, якія мы рэкамендуем замежным турыстам, паколькі дакладна ведаем, што там веласіпедыстам будуць рады.

**Вольга ПРАЛЮК.**
**Фота з архіва МРТ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 5 красавіка 2018 года.**